PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 42 (2423) Год XLVII | Беласток, 20 кастрычніка 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Вышэйшая адукацыя ў Гайнаўцы

Аляксей Мароз

Адкрыццё акадэмічнага года ў Замясцовым аддзяленні кіравання асяроддзем Беластоцкага Політэхнічнага інстытута, якое знаходзіцца ў адрамантаваным будынку па вуліцы Пілсудскага ў Гайнаўцы, адбылося 7 кастрычніка і было важным для горада здарэннем. Раней у будынку адбываліся заняткі з завочнікамі і толькі 28 снежня 2001 года міністр нацыянальнай адукацыі Крыстына Лыбацка дала згоду на адкрыццё самастойнага стацыянарнага замясцовага аддзялення. Самыя вялікія пахвальныя словы атрымаў ад прамоўцаў прафесар Васіль Паскробка з Беластока, які быў названы хросным бацькам новаадчыненага аддзялення. Яшчэ пры распрацоўцы „Стратэгіі развіцця Гайнаўскага павета" дэкларавaў ён дапамогу пры арганізаванні ў Гайнаўцы вышэйшай установы і стрымаў слова. У гайнаўскім замясцовым аддзяленні распачало вучобу 120 студэнтаў на стацыянарным аддзяленні і каля 90 на завочным. Будуць таксама вучыцца завочнікі з Аддзялення кіравання ПІ, якое знаходзіцца ў Беластоку. Распачалі яны адукацыю ў Гайнаўцы ў мінулым годзе.

Сярод гасцей былі міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, епіскап Бельскі Грыгорый, гайнаўскія праваслаўныя і каталіцкія святары, намеснік рэктара Політэхнічнага інстытута ў Беластоку прафесар Францішак Семяняка і прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк выказаў спадзяванне, што новаадчыненае аддзяленне гэта толькі пачатак развіцця вышэйшай адукацыі ў Гайнаўцы, якая павінна стаць акадэмічным асяродкам. Дэкан новага аддзялення Альжбета Мальцан паінфармавала аб дамове з уладамі горада Гайнаўкі, Гайнаўскага павета, якая дала магчымасць адчыніць філіял беластоцкага інстытута. Гарадскія і павятовыя ўлады перадалі бясплатна ў карыстанне на два гады адрамантаваны гарадскі будынак і займаюцца яго ўтрыманнем. Для патрэб студэнтаў перададзены школьны інтэрнат Комплексу прафесійных школ. Заняткі будуць адбывацца ў біялагічным і хімічным кабінетах Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Гайнаўскія студэнты змогуць карыстацца кнігазборам гарадской бібліятэкі. Пры дапамозе Інтэрнэту студэнцкая моладзь будзе карыстацца бібліятэчнымі рэсурсамі вышэйшых навучальных устаноў. Зараз звыш паловы студэнтаў складаюць прыезджыя. Вучыцца ў Гайнаўцы рашыліся

[працяг ☞ 2]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Кандыдаты на радных Гайнаўкі — Яўген Сачко (злева) і Міраслаў Мордань

З дапамогай жыхароў

Размова са старшынёю Гайнаўскай рады Яўгенам САЧКО, які ўзначальвае Беларуска-народны выбарчы камітэт выбаршчыкаў і намеснікам бурмістра Гайнаўкі Міраславам МОРДАНЕМ.

— Мінае 4 гады як кааліцыя, у якую ўваходзіць Беларуска-народны выбарчы камітэт і СЛД, правіць у Гайнаўцы. Што важнага ўдалося зрабіць у горадзе за гэты перыяд?

Яўген Сачко: — Раней галоўныя інвестыцыі рэалізаваліся ў цэнтры горада. За апошні перыяд, згодна з выбарчымі абяцаннямі, рэалізавалі мы многія інвестыцыі на акраінах. Будавалі там з дапамогай жыхароў горада водаправоды, каналізацыю і дарогі. Каб не іх ініцыятывы і дапамога, не было б столькі інвестыцый і таму ад імя радных БНВК хачу падзякаваць нашым жыхарам.

Міраслаў Мордань: — Зараз амаль 100% кватэр падключаны да водаправоднай сеткі. За апошнія 4 гады збудавалі мы больш за 47 кіламетраў каналізацыйнай сеткі, асфальтавалі 44 вуліцы даўжынёй амаль у 13 кіламетраў. Выканалі 3 кіламетры цеплатрасы і ліквідавалі 11 вуглевых кацельняў, якія забруджвалі горад. Давялі цёплую ваду да жыллёвага квартала „Міленіум" і праводзім да квартала распаложанага па вуліцы Арміі Краёвай. Змяніўся таксама выгляд горада. Рамантавалі камунальныя блёкі, мяняючы ў іх дахі, дацяпляючы сцены і кладучы новыя тынкі. Перабудоўвалі тратуары, насаджвалі дрэвы і трымалі чысціню ў горадзе. Стараемся заняць моладзь і дзеля гэтага ў жыллёвых кварталах будуем спартыўныя пляцоўкі.

Яўген Сачко: — Заўсёды гаварылася аб патрэбе затрымання моладзі ў Гайнаўцы, а мы зрабілі канкрэтны крок у гэтай справе. Ад 1 кастрычніка гэтага года распачалося ў Гайнаўцы дзённае навучанне ў Замясцовым аддзяленні кіравання асяроддзем Політэхнічнага Беластоцкага інстытута і, мабыць, гэта дасць пачатак развіццю вышэйшага школьніцтва ў нашым горадзе. Прыстасоўваецца будынак да патрэб гродскага суда, які павінен распачаць сваю дзейнасць са студзеня 2003 года. Грунтоўна рамантавалі мы школы, прадшколлі і парадкавалі іх наваколле. Зрабілі парадак вакол рынку, пераносячы гандлёвую дзейнасць на суседнюю плошчу. Паспяхова закончыліся нашы намаганні наконт рамонту ваяводскіх і павятовых дарог. Пакладзены быў асфальт на вуліцах Беластоцкай, Пілсудскага, Варшаўскай, Ліповай і зараз выконваецца новае скрыжаванне па вуліцы 3 Мая.

— Нядаўна ў Гайнаўцы звольнілі трэцюю частку працоўнага калектыву Машыннага прадпрыемства „Гамех". Працу шукае многа маладых і старэйшых людзей. Як змагаецеся з беспрацоўем?

Яўген Сачко: — Гарадскія ўлады адкрытыя на прымяненне льготаў для гайнаўскіх прадпрыемстваў і стараемся дапамагаць усім згодна з нашымі юрыдычнымі магчымасцямі. Аднак, развіццё фірмаў залежыць, перад усім, ад агульных умоў развіцця эканомікі ў краіне і ад свабоднай канкурэнцыі на рынках продажу прадуктаў. Аб умовах, у якіх апынулася прадпрыемства „Гамех", гаварылі мы на асобнай сесіі. Стараемся распаўсюджваць інфармацыю аб нашых фірмах у Польшчы і за яе межамі. Намагаемся, каб работы ў горадзе выконвалі мясцовыя суполкі.

Міраслаў Мордань: — Ведаючы складаныя ўмовы, у якіх апынуліся гайнаўскія прадпрыемствы, не ўводзім вы-

[працяг ☞ 2]

Ці зарасце травой чыгунка? ☞ 3

Паводле чыгуначных падлікаў, толькі 7% коштаў пасажырскіх перавозаў на адрэзку з Гайнаўкі ў Цісоўку складаюць прададзеныя білеты. Аказваецца, што галоўнымі пасажырамі (80-85%) з'яўляюцца самі чыгуначнікі і іх сем'і. А чыгуначнікі не купляюць білетаў...

Яўрэі, балахоўцы, пятлюраўцы... ☞ 4

Калі чытаецца матэрыялы пра падзеі на Палессі ў 1919-1921 гадах, сустракаецца шмат падабенстваў да сітуацыі на Беласточчыне ў першыя пасляваенныя гады. Тысячы старонак друку пра рабаваных, мардаваных, паленых усялякімі войскамі людзей. Але найбольш у савецкіх дакументах захавалася звестак аб праследаванні яўрэяў салдатамі генерала Балаховіча і атамана Пятлюры.

Нас (не) дагоняць ☞ 4

У такі клімат прыязджаюць у Польшчу з Расіі дзве паненкі пад дваццаць: „Тату". Спяваюць па-руску, паводзяць сябе *nieobyczajnie*, значыць, экспануюць свой гомасексуальны ўхіл. Тлумы палякаў на канцэртах — у эйфарыі. Хіба першы раз ад ранняй Алы Пугачовай і яе выступленняў у Сопаце. Палякі хорам падпяваюць: „Нас не догонят!" Штосьці ў народзе мяняецца.

Камяні У. Сыракомлі ☞ 9

Залучча ў палове XIX стагоддзя лічылася меккай ідэалаў і мастацтва. Сюды прыязджала студэнцкая моладзь, літаратары, філосафы і мастакі. Сакратаром „лірніка" быў не хто іншы, як Вінцэсь Каратынскі. У суседнім маёнтку Жацерава жыў Янка Лучына, а ў самым Жукавым Барку — Антон Пяткевіч, вядомы ў літаратуры як Адам Плуг.

Мама ўсё жыццё сумавала па Беласточчыне ☞ 10

Са слоў маці Юліі Каральчук (жыхаркі Слоніма) я даведалася, што да вайны мы жылі ў вёсцы Лука. Калі ў 1941 годзе на Беласточчыну прыйшлі немцы, нас яны вывезлі ў Беласток. Спачатку мы жылі ў лагеры, а пасля нас немцы пасялілі ў доме па Мазавецкай вуліцы.

У Орлі размаўляем па-свойму ☞ 11

Прыгадваю сабе шумны эпізод у арлянскай гэсаўскай краме ў час салідарніцкага ўзлёту. Нейкая жанчына, якая прыехала да нашай шаптухі, увайшоўшы ў краму пачула, што людзі між сабою размаўляюць па-свойму. Яна вельмі ўскіпела і закрычала: „A co, po polsku to nie umie rozmawiać!"

Беларусь — беларусы

З дапамогай жыхароў

[1 ☞ працяг]
сокіх падаткаў і сёння яны адны з ніжэйшых у нашым ваяводстве. Фірмы падпарадкаваныя гарадскім уладам, напрыклад, Прадпрыемства водаправодаў і каналізацыі ці Прадпрыемства камунальных паслуг ангажуюцца ў публічныя працы і дзякуючы ім развіваюцца.

— Перад апошнімі выбарамі ставілася пытанне пра актывізацыю навучання беларускай мовы ў Гайнаўцы. Ці ўдалося рэалізаваць гэтую пастанову?

Яўген Сачко: — Вялікім поспехам можна назваць арганізаванне Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы пры белліцэі і стварэнне з іх Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы. Гэтым спосабам узрасла колькасць моладзі, якая вучыцца беларускай мове ў гайнаўскіх гімназіях. Радныя БНВК хадзілі на сустрэчы з бацькамі, у час якіх тлумачылі аб патрэбе вучобы роднай мове. У выніку павялічылася колькасць дзяцей, якія вучацца беларускай мове ў падставовых школах.

— Ад многіх гадоў будуецца ў Гайнаўцы Беларускі музей. Ці гарадскія ўлады рашыліся ўспамагчы яго пабудову?

Яўген Сачко: — Ад пачатку кадэнцыі шукаем дапамогі музею з боку ўлад горада, павета і ўрадавых структур. Але, трэба гэтае пытанне паставіць нашым каліцыянтам з СЛД. Чаму пры такіх магчымасцях атрымання дапамогі, якія ў іх цяпер ёсць, яшчэ не працуе музей так як павінен. Адказам на пытанне можа быць таксама склад управы Камітэта пабудовы Беларускага музея. Пасольскае бюро СЛД знаходзіцца ў Беларускім музеі, а БНВК гнездзіцца на паддашку старога будынка па вуліцы кс. Верабея.

— Выдатная большасць жыхароў горада гэта праваслаўныя вернікі. Ці ўспамагаеце дзейнасць праваслаўных арганізацый?

Яўген Сачко: Падтрымоўвалі мы фінансава дзейнасць Гайнаўскага аддзялення Праваслаўнага брацтва св. св. Кірылы і Мяфодзія ў іх працы з дзяцьмі, успамагаем Дом сацыяльнай дапамогі „Самаранін" і праклалі тратуары вакол царкоўнай плошчы.

— Вы, спадар Яўген, з'яўляецеся старшынёю новаствоpанага ў Гайнаўцы Беларуска-народнага выбарчага камітэта выбаршчыкаў. Якіх кандыдатаў на бурмістраў і войтаў рашыліся Вы паставіць у Гайнаўскім павеце?

Яўген Сачко: — У Гайнаўцы за пасаду бурмістра будзе змагацца двух беларускіх, праваслаўных кандыдатаў і мы не ставім свайго, каб яшчэ больш не разбіваць наша асяроддзе. Сваіх кандыдатаў на войтаў ставім у Чыжоўскай гміне — Юрку Васілюка і ў Дубіцкай — Пятра Багроўскага.

— Калі няма ў Вас сваёй прапановы на бурмістра Гайнаўкі, можа плануеце аказаць падтрымку кандыдату іншага камітэта?

Яўген Сачко: — Жыхары Гайнаўкі добра ведаюць кандыдатаў на бурмістра і ведаюць, што яны зрабілі і што могуць зрабіць. Няхай гайнавяне самі, без нашай падказкі, выбіраюць найлепшую асобу. Кандыдаты на радных ад БНВК, якія ўвойдуць у Гарадскую раду, зробяць усё, каб як найлепш рэалізаваць нашу выбарчую праграму і будзем наглядаць, каб бурмістр добра кіраваў горадам.

— Ці ўдалося выставіць кандыдатаў на радных ва ўсіх гмінах Гайнаўскага павета?

Яўген Сачко: — Так, нашы кандыдаты будуць ва ўсіх гмінах Гайнаўшчыны.

— Чым хочаце заахвоціць, каб выбаршчыкі галасавалі менавіта на Вас?

Міраслаў Мордань: — На першым месцы ставім змаганне з беспрацоўем. Хочам прыцягваць інвестараў у Гайнаўку і гміны нашага павета. Маем намер класці каналізацыю, будаваць дарогі, тратуары і мадэрнізаваць блёкі. Будзем шукаць у еўрапейскіх фондах сродкі на развіццё нашага рэгіёна і намагацца, каб некаторыя інвестыцыі былі фінансаваны з дзяржаўнага бюджэту. Так як дагэтуль, будзем падтрымліваць развіццё беларускай культуры.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Расія скарачае бюджэт СБіР

Міністэрства фінансаў Расіі намерваецца скараціць долю Расійскай Федэрацыі ў бюджэце Саюза Беларусі і Расіі на 2003 г. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Мінску 11 кастрычніка расказаў намеснік старшыні камітэта Савета Федэрацыі па справах СНГ Леанід Лушкін. Гэта, па яго словах, высветлілася ў ходзе нядаўняга пасяджэння камітэта, на якім абмяркоўваўся наступны „саюзны" бюджэт. Сваё рашэнне расійскі ўрад матываваў тым, што беларускі бок на працягу апошніх гадоў хранічна не выконвае сваіх абавязацельстваў перад казной „саюзнай дзяржавы" і на сённяшні дзень яе задоўжанасць складае каля 1 млрд. расійскіх рублёў.

У адказ старшыня Камісіі па нацыянальных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Мікалай Чэргінец заявіў: „Мы ставімся да гэтага крайне негатыўна. Лічым, што дамоўленасці паміж абедзвюма краінамі павінны выпаўняцца на ўсе сто працэнтаў абодвума бакамі і мы ўжо звярнуліся ў Міністэрства фінансаў і да ўрада з просьбай разабрацца і, у рэшце рэшт, вырашыць гэта пытанне".

Навіны Хартыі '97

Польскія ветэраны пад Леніна

11-13 кастрычніка г.г. у мерапрыемствах, прысвечаных 59-й гадавіне бітвы пад Леніна ўдзельнічалі прадстаўнікі польскай грамадскасці. Дэлегацыю з 80 чалавек састаўлялі ветэраны I Польскай дывізіі імя Тадэуша Касцюшкі, прадстаўнікі іншых польскіх ветэранскіх арганізацый і гарцэры. Мерапрыемства арганізаваў Магілёўскі аблвыканкам. Прысутнічалі на ім беларускія і расійскія ветэраны, вайскоўцы і школьнікі.

Паводле mfa.gov.by

Беларусь — краіна азіяцкая?

Апошнія вераснёўскія дні ў палітычным жыцці Беларусі сталі свайго роду падвядзеннем вынікаў у стасунках з іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. На жаль, вынікі гэтыя большай часткай несуцяшальныя.

Парламенцкая Асамблея Рады Еўропы зноў заявіла аб сваім непрыняцці за сучасныя цывілізаваныя тых парадкаў, што пануюць зараз на абшары паміж Бугам і Дняпром. Нягледзячы на вялікія намаганні беларускіх улад увайсці на роўных правах у гэтую арганізацыю, справа не рухаецца з месца.

Трэба адзначыць, што Рада Еўропы даволі лагодная да прыняцця новых сябраў у свае шэрагі ў параўнанні, напрыклад, з Еўрасаюзам. Але нават туды дзверы для Беларусі застаюцца зачыненыя.

Яшчэ ўзімку 1997 года пасля апошняга рэферэндуму статус адмыслова запрошанага сябры ў Радзе Еўропы для Беларусі быў скасаваны. Прычыны вядомыя — парушэнне ўласных законаў пры правядзенні гэтага самага рэферэндуму выканаўчай уладай.

Шчыра кажучы, за пяць гадоў, што мінулі з той пары, шанцаў да аднаўлення гэтага статуса ў беларускага кіраўніцтва было больш, чым дастаткова. Варта было крыху лібералізаваць эканоміку, не надта ўжо ціснуць на апазіцыю, увесці мараторый на смяротнае пакаранне, ну і крыху палепшыць сітуацыю з правамі чалавека, асабліва ў галіне свабоды слова. Калі б гэтыя ўсе чыннікі былі ўспрыняты лукашэнкаўскай адміністрацыяй усур'ёз, а не з пазіцый безадказнага ківання на хібы ў развіцці дэмакратыі ў іншых краінах-сябрах Рады Еўропы, то ўжо даўно дэпутаты беларускай Палаты прадстаўнікоў лічылі б сябе паўнавартаснымі высокапастаўленымі еўрапейцамі. Але, па ўсім відаць, здаровы сэнс калі і ёсць ва ўзаемадачыненнях лукашэнкаўскага кіраўніцтва з Еўропай, то знаходзіцца далёка не на першым плане. Ігнараванне элементарных патрабаванняў з боку той жа Рады Еўропы, верагодна, рабілася з мары ў тое, што ў недалёкім будучым на еўразійскім абшары паўстане вялікі і магутны Саюз Беларусі і Расіі, які, як калісьці СССР, будзе сам дыктаваць сваю волю ўсяму свету, а не толькі „якойсьці там" Еўропе.

Рэчаіснасць, тым не менш, шмат у чым адрозніваецца ад таго, што марыцца. Банкруцтва лукашэнкаўскай палітыкі на ўсходнім напрамку, якое сталася з-за непамерных амбіцый беларускага прэзідэнта, і палітычная самаізаляцыя ад заходніх, паўночных і паўднёвых суседзяў прывяла да таго, што Беларусь пераўтвараецца ў краіну-ізгоя.

З усіх 48 дзяржаў еўрапейскага кантынента 47 уваходзяць у вышэйзгаданую арганізацыю. Аб тым, калі прадстаўнікі 48-й, гэта значыць Беларусі, атрымаюць магчымасць неяк уплываць на тыя рашэнні, што прымае Рада Еўропы, а гэта значыць прадстаўляць Беларусь як яе сябра, пакуль невядома.

У прынятай на апошнім пасяджэнні ПАРЕ рэзалюцыі па беларускім пытанні зноў прагучала праблема зніклых палітыкаў. І ўжо не толькі прагучала, але і набыла практычнае ўвасабленне спробы яе вырашэння. Цяпер створаны „спецыяльны падкамітэт па расследаванні абставін знікнення па нібыта палітычных прычынах у Беларусі".

Не забыліся еўрапейскія дыпламаты і пра пагаршэнне сітуацыі са свабодай слова, асабліва ў плане крымінальнага перасследу апазіцыйных журналістаў.

Усе гэтыя і ранейзгаданыя чыннікі сведчаць аб тым, што беларускі рэжым па-ранейшаму застаецца за мяжой яго прызнання Радай Еўропы. Папраўдзе, яго гэта ў даны момант не надта хвалюе. Калі ўзгадаць выказванні самога А. Лукашэнкі пра не самамэту сяброўства ў еўрапейскіх структурах, то натуральным падаецца заява аднаго з дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў С. Касцяна аб тым, што „начхаць мы хацелі на гэтую ПАРЕ, якая ёсць васалам ЗША... Трыста гадоў Беларусь пражыла без Еўропы і яшчэ пражыве тысячу гадоў".

Каментаваць глупствы жадання не выклікае. Але вынікам кіравання такіх антыеўрапейцаў ужо стала тое, што беларускай дзяржаве нічога не застаецца як шукаць знешнепалітычных партнёраў за тысячы кіламетраў ад сваіх межаў і сярод тых, да каго з непрыязнасцю ставіцца цывілізаваны свет. Гаворка ідзе аб кіраўніцтвах Ірака і Ірана.

Магчыма, у будучым, калі беларуская прадукцыя не страціць сваіх пазіцый у гэтых краінах, такое супрацоўніцтва прынясе плён. Але больш верагодным падаецца, што закрыццё сваёй эканомікі і палітыкі ад перадавых ідэй і тэхналогій, якія ў стане выпрацоўваць толькі адкрытыя грамадствы, не дасць беларускай дзяржаве ні цяпер, ні потым ані палітычных, ані сур'ёзных эканамічных дывідэндаў.

Уладзімір Лапцэвіч

Вышэйшая адукацыя ў Гайнаўцы

[1 ☞ працяг]
не толькі жыхары Падляшша, але і моладзь з Вармінска-Мазурскага, Мазавецкага і Люблінскага ваяводстваў.

Спачатку студэнты будуць вучыцца на адным напрамку „Ахова асяроддзя" і адной спецыяльнасці „Гаспадаранне на прыродазнаўча вартасных тэрыторыях". Сваю адукацыю будуць канчаць са званнем інжынера пасля трох з паловай гадоў вучобы. Магістрамі будуць пасля далейшай вучобы ў Політэхнічным інстытуце ў Беластоку. Выкладчыкамі будуць супрацоўнікі навуковых інстытутаў Белавежы і Беластока. З Мінска прыедзе прафесар Эдуард Міхневіч. Прыняты на працу ў аддзяленні таксама гайнавяне. Прафесар Альжбета Мальцан сказала, што выпускнікі стануць спецыялістамі па ахове прыроды так патрэбнымі ў нашым ваяводстве, дзе юрыдычна ахоўваецца шмат тэрыторый.

Студэнты далі прысягу, атрымалі заліковыя кніжкі, студэнцкія білеты і выслухалі першую лекцыю прафесар Сімоны Косак пра ахову прыроды.

Аляксей Мароз

Папяровыя намеры

Чэрвень быў месяцам вельмі цёплым і сухім, — гэта не пачатак рамана пра любоў. Гэтак гучыць адзін з першых сказаў з *Założeń polityki społeczno-gospodarczej województwa podlaskiego na 2003 r.*. Гэтыя прапановы былі дыскутаваны на апошняй — развітальнай сесіі сейміка і маюць быць падставай для апрацоўкі новага бюджэту, які будзе прыняты ўжо наступным ваяводскім самаўрадам.

Наколькі ў адносінах да сённяшняй сітуацыі ў дакуменце шмат канкрэтаў, то напрамкі развіцця ваяводства — досыць асцярожныя і найчасцей запісаны ў агульных фразах. Даведваемся, вось, што ў мінаючым годзе наступіла ў нашым рэгіёне зніжэнне прадукцыі спажывецкага збожжа і мясной жывёлы, а павысілася скупка малака. У сваю чаргу, напрыклад, прыбыткі ў будаўніцтве былі намнога ніжэйшыя за леташнія. У ваяводстве заўважаецца далейшы адплыў вяскоўцаў у гарады. Большы ў ваяводстве адсотак людзей дапрадукцыйнага ўзросту. „Недахоп прапанавання на рынку працы ў рэгіёне можа паўплываць на змяншэнне і так невысокіх заробкаў, а тым самым на пабольшанне міграцыйных працэсаў", — піша аўтар праекта, праўленне ваяводства. Заўважана паніжэнне заняцця і то ўва ўсіх сферах. Што цікава — найбольшы заняпад у занятасці (на 25,2 прац.) — у гасцініцах і рэстаранах, хоць адным з прыярытэтаў падляшскіх самаўрадаў (гмінных, павятовых і ваяводскага) апошніх чатырох гадоў меў быць турызм. Прычым вельмі рэзка панізіліся заробкі. Аказалася, найбольш у апошні час зараблялі асобы занятыя на пошце і ў тэлекамунікацыі (амаль 3 тыс. зл.) і ў прадпрыемствах, якія займаліся дастаўкай вады, электраэнергіі, газу (амаль 2,5 тыс. зл.). Аднак гэта выключэнні. Генеральна наступіла паніжэнне заробкаў, што мае ўплыў на паніжэнне продажу тавараў.

У суме, вобраз падляшскай рэчаіснасці апошніх гадоў не ёсць такі і вясёлы. Да такой высновы даходзіць цяперашняе — правае праўленне ваяводства. Канкрэтна, аднак, уступаючыя ўлады рэгіёна мала прапануюць. З цікавінак: хочуць змагацца з беспрацоўем шляхам занятку прызыўнікоў у рамках альтэрнатыўнай службы. Да таго гучаць у гэтай і іншых галінах агульныя фразы кшталту „дзеянні дзеля асоб, якім пагражае звальненне з працы".

У падлягаючых ваяводскаму самаўраду асветных пляцоўках намеры таксама „значныя". Шмат дзе зводзяцца яны да планавання замены вокан, дзвярэй ці памалявання сцен у класах. Загадкава гучыць адзін з пунктаў, які датычыць намераў наконт аховы здароўя і грамадскай палітыкі. Вось праўленне прагне займацца, увага: „накіроўваннем асоб у апякунча-лячэбныя ўстановы". Можна мець толькі надзею, што выбар гэтых асоб не будзе праводзіцца паводле палітычнага ключа.

Ці беларусы могуць знайсці ў *Założeniach* штосьці, што датычыла б якраз іх, не ўлічваючы агульнаграмадскіх карысцей і некарысцей? У раздзеле дакумента „Культура і мастацтва" першай мэтай, якая будзе рэалізавацца ў наступным годзе, мае быць „ахова культурнай спадчыны". Што пад гэтым паняццем скрываецца, аўтары не тлумачаць. Падобна як і мэты „стварэння ўмоў дзеля захавання і развіцця культуры нацыянальных меншасцей". Магло б здавацца, што, для прыкладу, ваяводскі самаўрад гатовы даць шмат грошай на пабудову ў Беластоку Цэнтра беларускай культуры. Згодна са сцвярджэннямі падляшскага маршалка Славаміра Згжывы, успамаганнем дзеянняў меншасцей займаецца галоўным чынам падчынены ўправе Ваяводскі асяродак анімацыі культуры. Дык як мела б памагаць ВААКу ўправа? Вось адказ: „неабходны ёсць рамонт балконаў і часткі электрасістэмы".

Праўленне затое памятае аб неабходнасці правядзення рэстаўратарска-рамонтных прац пры Палацы архімандрытаў у Супраслі, у частцы прадбачанай на аддзел Падляшскага музея. Можна разлічваць, што беларусы знойдуць, аднак, сваё месца ў мерапрыемствах арганізаваных ВААКам, асабліва ў праектах „Падляшша бліжай Еўропы" ці „Карані нашы ёсць тут". Хоць у другім выпадку ўжо ёсць агаворка, што мае ён „dotyczyć upowszechniania postaw patriotycznych" (паляка-каталіка?).

Можа цешыць, што адным з найважнейшых прыярытэтаў у рамках ваяводскага мецэната мае быць падтрымка (арганізацыйная, фінансавая?) пачынанняў асацыяцый нацыянальных меншасцей, сярод гэтага: XXII Фестывалю царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы (першы прыярытэт), II Міжнародных мастацкіх сустрэч у Тапіле пад Гайнаўкай (III прыярытэт), Фестывалю беларускай песні (прыярытэт VI). Беларусаў з былога Беластоцкага ваяводства можа таксама ўцешыць план мадэрнізацыі дарогі Заблудаў — Нарва — Гайнаўка — Кляшчэлі на адрэзку Кляшчэлі — Елянка і вуліц Спартыўнай ды Беластоцкай у Гайнаўцы ці дарогі Кудэлічы — Паўлавічы — Грабарка — Каянка. Мадэрнізацыя, аднак, скрыжаванняў ці мастоў плануецца ўжо толькі на тэрыторыі былых Сувальскага і Ломжынскага ваяводстваў і вакол Лап.

Іншым дакументам, над якім разважалі радныя на апошнім пасяджэнні сейміка, была „Праграма развіцця чыгуначнага транспарту ў Падляшскім ваяводстве да 2005 г., з перспектывай да 2015 г.". Прыярытэтам мае быць „утрыманне рэгіянальнага руху ліній мясцовага значэння". Аднак прадказваецца ў апрацоўцы м.інш. мадэрнізацыя лініі Беласток — Бельск-Падляшскі — Чаромха — мяжа дзяржавы. Аўтары сцвярджаюць дрэнны стан пуцей Седльцы — Чаромха — Гайнаўка — Нязнаны Бор на адрэзку Гайнаўка — Нязнаны Бор і прадказваюць чарговае адмяненне пасажырскіх перавозаў на лініі Гайнаўка — Семяноўка — Цісоўка — мяжа дзяржавы. Таксама ёсць пагроза закрыць, па тэхнічных прычынах, лінію Чаромха — Беласток.

Затое аптымістычна гучыць план мадэрнізацыі станцыі Кузьніца-Беластоцкая і перагрузачнай станцыі ў Саколцы ды станцыі Зубкі-Беластоцкія бліз дарожнага пагранперахода ў Баброўніках. Рэйкавыя аўтобусы маюць быць уведзены на лініях Беласток — Зубкі-Беластоцкія, Беласток — Гайнаўка, Гайнаўка — Чаромха, Чаромха — Беласток. Маюць быць прыстасаваныя на патрэбы калекіх асоб камунікацыйныя комплексы: будынак вакзала — пероны на станцыях у Беластоку, Бельску-Падляшскім, Гайнаўцы і Чаромсе. Найдаражэй мае каштаваць мадэрнізацыя чыгуначнай лініі Беласток — Чаромха — мяжа дзяржавы (80 мільёнаў зл.) ды Саколка — Кузьніца-Беластоцкая — мяжа дзяржавы (45 млн. зл.). Ці на гэта знойдуцца грошы, аўтары апрацоўкі — Даследчы асяродак эканомікі транспарту — не адказваюць. Пакуль што, як і чыгуначныя планы на найбліжэйшыя гады, так і бюджэтныя палажэнні на будучы год, застаюцца толькі на паперы. Давядзецца імі заняцца радным наступнай кадэнцыі. Можна было б мець надзею, што самаўрадаўцам прадстаўляючым інтарэсы беларускага асяроддзя.

Мацей Халадоўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ці зарасце травой чыгунка?

Чыгуначныя пуці на шляху Гайнаўка — Бельск-Падляшскі зараслі ўжо травой

Намеснік дырэктара Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных чыгуначных перавозаў у Беластоку Чэслаў Суліма паінфармаваў радных Гайнаўскага павета на сесіі, якая адбылася 26 верасня, што толькі да канца года яго прадпрыемства можа гарантаваць пасажырскія чыгуначныя перавозы на Гайнаўшчыне (з 4 да 2 зменшацца з кастрычніка рэйсы чыгуначнага аўтобуса з Гайнаўкі ў Цісоўку). У наступным годзе могуць быць ліквідаваны не толькі пасажырскія перавозы з Гайнаўкі ў Цісоўку, але з Чаромхі ў Бельск-Падляшскі і Гайнаўку.

— Вы нас увесь час палохаеце. Хопіць гэтага страшання, бо ад яго некаторыя пухнуць, — заявіў усхваляваны войт Чаромхаўскай гміны Міхал Врублеўскі. Прасіў ён захаваць чыгуначны транспарт у яго гміну і ў найгоршым выпадку абмежаваць колькасць пасажырскіх рэйсаў. Прапанаваў праверыць рэйкі і рамантаваць іх на кароткіх адрэзках, а пасля адмяніць абмежаванне хуткасці цягнікоў з Чаромхі ў Беласток з 30 кіламетраў у гадзіну на 50. Пасажыры, якія маюць выбар паміж павольным чыгуначным транспартам з Беластока ў Чаромху і хуткім, танным транспартам на прыватных мікрааўтобусах, а нават даражэйшых аўтобусах, выбіраюць апошнія і таму цягнікі пустуюць.

Павятовыя радныя прапанавалі падпісаць пагадненне з чыгуначным прадпрыемствам па перавозцы грузаў наконт даплат да пасажырскіх перавозаў на адрэзках, дзе перавозіцца многа грузаў. Апошнім часам праз Гайнаўку перавозяць многа небяспечных для людзей і Белавежскай пушчы прадуктаў. Аднак, дырэктар Чэслаў Суліма не развіваў гэтай тэмы, засяроджваючыся на нерэнтабельнасці пасажырскіх перавозаў. Паводле чыгуначных падлікаў, толькі 7% коштаў пасажырскіх перавозаў на адрэзку з Гайнаўкі ў Цісоўку складаюць прададзеныя білеты. Аказваецца, што галоўнымі пасажырамі (80-85%) з'яўляюцца самі чыгуначнікі і іх сем'і. На іншых маршрутах яны таксама становяцца частымі пасажырамі. Чыгуначнікі не купляюць білетаў і не павышваюць рэнтабельнасці перавозаў. Але гэта не павінна вырашаць пра абмежаванні ў чыгуначным транспарце або яго ліквідацыю. Намеснік старшыні рады Мікола Бушко прапанаваў шукаць ашчаднасцей у лепшай арганізацыі пасажырскага транспарту.

Войт Нараўчанскай гміны і заадно павятовы радны Мікола Павільч прапанаваў, што яго гміна можа чыгуначнаму прадпрыемству зняць падаткі, якія яно плаціць у гмінную касу за пасажырскія перавозы. Намякаў ён, што гмінныя работнікі могуць прыбіраць на пасажырскіх вакзалах, але гэтыя прапановы не былі станоўча ўспрыняты дырэктарам Чэславам Сулімам. У наступным годзе будзе папраўлены расклад ад'езду цягнікоў на Гайнаўшчыне, згодна з прапановамі радных (калі гэтыя цягнікі будуць яшчэ ездзіць — А. М.). Пасажырскі транспарт з Чаромхі ў Беларусь, хутчэй за ўсё, будзе зменены. Плануецца, што аўтобусы, якія замест цягніка будуць ездзіць два разы ў дзень, не будуць даязджаць да Брэста, але толькі да Высока-Літоўска.

Радныя прагаласавалі супраць ліквідацыі чыгуначных перавозаў на Гайнаўшчыне і будуць хадайнічаць перад чыгуначнымі ўладамі і Маршалкоўскай управай у Беластоку, праз якую праходзяць дзяржаўныя датацыі для чыгуначнага пасажырскага транспарту, аб яго захаванні. Старшыня рады Вольга Рыгаровіч намякнула ў канцы дыскусіі, што перад вайной чыгуначныя ўлады прыязджалі на спатканні на сваім транспарце. Калі б сёння прадстаўнікі чыгункі захацелі даехаць у Гайнаўку на цягніку, мусілі б некалькі гадзін ехаць з Беластока ў Чаромху з хуткасцю 30 кіламетраў у гадзіну, а пасля перасесціся на цягнік у Гайнаўку.

Аляксей Мароз

Дарога з Юшкавага Груда ў Міхалова — небяспечная!

Маставая дарога з Юшкавага Груда ў Міхалова (Беластоцкі павет) — небяспечная! Яна асфальтаваная, але абодва краі палатна пакрышаныя. Грузавыя і пасажырскія аўтамашыны коламі пасцідалі кавалкі асфальту ў равы і зараз краі палатна паабрываныя ды ўхабістыя. Асабліва небяспечна, калі аўтамабілі мінаюцца. Хопіць папасці колам у глыбокую яміну ды скаціцца ў роў. Гэты адрэзак шляху не такі ўжо малы, бо ажно 13-кіламетравы.

Гэты сігнал кірую да дарожнай службы ў Беластоку. Дарогай з Юшкавага Груда ў Міхалова павінны неадкладна пацікавіцца павятовае і акруговае праўленні дарог. Праўда, паставілі яны адпаведныя да сітуацыі на гэтым шляху асцерагальныя знакі, але гэта не вырашае справы. (яц)

Вачыма паляка

Нас (не) дагоняць

Задзіўляе што і руш мяне ўрад Лешка Мілера, асабліва ягоная замежная палітыка. Вось прэм'ер падаўся на Украіну і запрасіў у Польшчу прэм'ер-міністра тае краіны. Усё ў час бунту ўкраінскага народа супраць прэзідэнта Кучмы і яго каманды, якіх лічаць „замардыстамі". Мілер прыехаў на Украіну зараз пасля чарговых маніфестацый на вуліцах Кіева і сусветных пратэстаў, а затым і байкоту ў сувязі з продажам Украінай зброі Іраку. Мілер вагаўся, ці ехаць, аднак, адважыўся, — пісалі ў польскамоўнай прэсе. Сам прэм'ер тлумачыўся: „Да суседа трэба ездзіць, таксама тады, калі ў яго праблемы".

Польскі прэм'ер, вядома, на Украіне размаўляў таксама з апазіцыяй.

Ну, добра. Сябра — Мілерава Польшча правяраецца ў бядзе, з пункту гледжання Украіны (не ўлічваючы думкі часткі ўкраінскай апазіцыі). Мілер узяў на сябе цяжар медыяцыі паміж камандай Кучмы і апазіцыяй. Таксама добра. У мяне такое, вось, пытанне: а чаму такая палітыка ў адносінах толькі да аднаго суседа, у якога ёсць праблемы з дэмакратыяй? Побач распаложана іншая суседка, таксама з такімі ж праблемамі — Беларусь з падобным на Кучму прэзідэнтам, калі справа ў харызме, як хочуць адны, або дыктатарскімі замашкамі, як кажуць іншыя. Не разумею. Здагадваюся, што тут справа толькі ў эканамічных патэнцыялах, дакладна, у прыродных рэсурсах і рынку збыту, якія адрозніваюць тэарэтычна багацейшую Украіну ад Беларусі. Бачыце, калі справа ў грашах, нават урад глухі на „фанабэрыі" звязаныя з прынцыпамі дэмакратыі.

— Адносіны з Украінай маюць стратэгічны маштаб, — кажа Мілер.

Мабыць, я памыляюся і не заўважаю дальнабачную палітыку нашага сённяшняга ўрада. Мабыць, дачакаюся донкіхоцкіх дзеянняў Мілера і ў Беларусі. Ды, здаецца, не. Яшчэ ў чэрвені міністр замежных спраў Польшчы Владзімеж Цімашэвіч запэўніваў мяне, што за ягонага ўрада не можа быць гаворкі пра любыя афіцыйныя кантакты з Беларуссю на найвышэйшым дзяржаўным узроўні. Мабыць, гэты прынцып адмяніць можа нечаканае адкрыццё на Беларусі значных залежаў нафты ці іншага таксама каштоўнага багацця. Тады палітыка Польшчы ў адносінах да палітыкі Аляксандра Лукашэнкі кіравацца будзе прынцыпам: „Не бачу, не чую; не мяшаемся ва ўнутраныя справы суседа" з узаемным паляпваннем па дружных плечах прэзідэнтаў ды прэм'ераў у аб'ектывах тэлекамер.

Задзіўляе мяне час ад часу беластоцкая выбарчая кампанія. Асабліва тое, што чуваць у падзеленай сёння правіцы, дагэтуль кіруючай горадам (якая чатыры і восем гадоў таму даходзіла да еднасці). Памятаю, як на папярэдніх самаўрадавых выбарах у сядзібе „Салідарнасці" па вуліцы Суражскай шэф падляшскага прафсаюза Юзаф Мазалеўскі і тады ім назначаная ваявода Крыстына Лукашук з сашчымленымі зубамі і з мусу загаданага кааліцыйным (АВСУВ) цэнтрам адабрала тады унійнага віцэ-ваяводу Юзафа Кліма (сёння Грамадзянская платформа). Быў ён, на думку лакальнага кіраўніцтва АВС — меншым ліхам, чым прапанаваныя кандыдатуры „уніята" Марка Хайноўскага ці беларуса Алега Латышонка. Клім быў *mniejszym złem*! А што бачу сёння? У першых радах выбарчай канвенцыі Беластоцкага паразумення правіцы сядзяць поруч сябе Мазалеўскі і Клім. З трыбуны чытае натацыю Дональд Туск, лідэр Уніі вольнасці, а цяпер Платформы. Мазалеўскі яму апладзіруе. Ліберал Туск падтрымлівае кандыдатуру на прэзідэнта Беластока прэзідэнта Рышарда Тура з партыі, якая да нядаўна называлася Хрысціянска-нацыянальным задзіночаннем (ZChN) — пішу „да нядаўна", бо не ведаю, ці гэта фармацыя яшчэ дзейнічае, прынамсі з такім назовам. Туск абвяшчае:

— Беласток гэта традыцыйны бастыён правіцы, а Рышард Тур — найлепшы кандыдат на прэзідэнта.

Тым часам беластоцкі прэзідэнт папярэдняй кадэнцыі Кшыштаф Юргель папракае Тура, колішняга віцэ-прэзідэнта, за пагружэнне горада ў даўгах: на канец года Беласток будзе задоўжаны на 120 мільёнаў злотых.

— Камітэт, які прапануе Рышарда Тура, гэта AWS-bis, — кажа з яўнай антыпатыяй Юргель і паказвае лепшага правага кандытата: Марка Казлоўскага, сёння — віцэ-прэзідэнта. Быццам той Казлоўскі не меў свайго ўдзелу ў гэтым завінавачанні.

— Трэба перш за ўсё прыспешыць развіццё горада і працягваць пачатыя інвестыцыі, — кажа Рышард Тур.

— Трэба перш за ўсё распачаць пагашэнне даўгоў, — адказвае яму Марэк Казлоўскі.

У такі клімат прыязджаюць у Польшчу з Расіі дзве паненкі пад дваццаць: „Тату". Спяваюць па-руску, паводзяць сябе, як сказалі б Тур-Юргель і Казлоўскі разам узятыя *nieobyczajnie*, значыць, экспануюць свой гомасексуальны ўхіл. Тлумы палякаў на канцэртах — у эйфарыі. Хіба першы раз ад ранняй Алы Пугачовай і яе выступленняў у Сопаце. Палякі хорам падпяваюць: „Нас не дагонят!" Штосьці ў народзе мяняецца. А калі так, дык ці не пара памяняць беластоцкую ўладу, няважна, пад якой шыльдай хаваецца прадстаўнік *bastionu prawicy*. І ці не час перадумаць сваю палітыку ў адносінах да ўсходніх суседак. І тады, можа, „нас не дагоняць"?

Мацей Халадоўскі

Яўрэі, балахоўцы, пятлюраўцы і пілсудчыкі на Палессі

Пасля І сусветнай вайны праз Палессе праходзілі шматлікія арміі, а палітычныя і крымінальныя групоўкі надоўга сталі часткай палескага краявіду. Правінцыю гэту бачылі ў сваіх межах палякі, расіяне, украінцы і беларусы. Лясы і балоты стваралі добрыя ўмовы для партызанскага руху, а перш за ўсё — для змагання мясцовых сялян з няпрошанымі гасцямі.

Калі чытаецца матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь пра падзеі на Палессі ў 1919-1921 гадах, сустракаецца шмат падабенстваў да сітуацыі на Беласточчыне ў першыя пасляваенныя гады. Тысячы старонак друку пра рабаваных, забіваных, паленых усялякімі войскамі людзей. Не было арміі, якая не гвалтавала б і не расстрэльвала б, але найбольш у савецкіх дакументах захавалася вестак аб праследаванні яўрэяў салдатамі генерала Балаховіча і атамана Пятлюры. Адны і другія лічылі яўрэяў прыхільнікамі бальшавіцкай улады, таму агрэсія салдат кіравалася не толькі супраць канкрэтных асоб, заангажаваных у палітычнае жыццё, але таксама супраць усяго мірнага яўрэйскага насельніцтва. Балахоўцы прыйшлі на Мазыршчыну зараз пасля пятлюраўцаў, таму яўрэі ахвотна параўноўвалі абедзве арміі. Пятлюраўцы найчасцей расстрэльвалі для ідэі, балахоўцы — за незаплачаныя падаткі, якія назначалі адразу пасля ўваходу ў вёску. Прыхільнасць салдат Балаховіча — гаварылі яўрэі — можна было прыдбаць самагонкай, а ў справе падаткаў — можна было таргавацца.

На Мазыршчыне ў вёсцы Жыдковічы, дзе яўрэйская міліцыя прабавала стрымаць паход войск Балаховіча, ледзь не дайшло да масавых рэпрэсій. Балаховіч загадаў расстраляць усіх мужчын і толькі мясцовы праваслаўны святар — пісалі чэкісты — стрымаў выкананне смяротнага прыгавору. У суседніх вёсках Белявыя і Ведчына забітых было 5 яўрэяў, большасць ацалела таму, што ў іх абарону стала мясцовае беларускае насельніцтва. Дакументы паказваюць сотні здарэнняў, калі пасля ўваходу польскіх, украінскіх ці беларускіх войск палескія сяляне скрывалі яўрэяў у сваіх хатах, гаспадарчых будынках.

Пасля багатай літаратуры пра падзеі ў Ядвабным, Радзяёве ды іншых мясцовасцях заходняй Беласточчыны ў ліпені 1941 г. выразна відаць розніцу менталітэту палескага і мазавецкага сялянства. Іншымі таксама былі палескія яўрэі, якія часцей займаліся сельскай гаспадаркай, а сацыяльныя ўмовы іхняга жыцця вельмі нагадвалі тыя, у якіх апынуліся мясцовыя сяляне. Гаварылі яны на мясцовым дыялекце і апрача веравызнання і рэлігійнай традыцыі нічым асаблівым не вылучаліся з ліку мясцовага насельніцтва. Чытаючы іх выказванні адчуваецца, што беларускіх сялян успрымалі яны як звычайных суседзяў, а не людзей іншай культуры. Таму і натуральным стала, што дапамагалі яны яўрэям, калі тым пагражала небяспека з боку прыбылага войска. Самі бальшавікі падкрэслівалі, што калі навісала пагроза гвалтаў, праваслаўныя святары скрывалі жыдоў у царкоўных памяшканнях.

У шмат якіх навуковых апрацаваннях часта сустракаецца інфармацыя пра пагромы яўрэяў на Палессі ў бурлівыя 1919-1921 гады. Амаль нідзе няма звестак пра тое, што мясцовы беларускі люд бараніў іх як мог ад здзекаў салдат. Самі яўрэі расказвалі савецкім уладам пра сотні такіх выпадкаў. Пэўна яшчэ больш такіх падзей не адлюстравана ў дакументах. Іншыя народы, маючы такія аргументы, зараз напісалі б сотні навуковых прац, мастацкіх твораў, паказалі б сябе як супольнасць, якая мела справядлівых і талерантных продкаў. Беларусам тым часам заўсёды нехта пісаў гісторыю, найчасцей паказваючы толькі факты, якія не дазвалялі ганарыцца сваёй мінуўшчынай. Таму ў навуковай літаратуры цяжка сустрэць прыклад беларускага селяніна, якому пачуццё справядлівасці не дазваляе спакойна глядзець як прышэльцы б'юць ці прыніжаюць жыдоўскага суседа. Выступае ён часцей у ролі бітага, якога вызваляе брат з Усходу.

Яўген Мірановіч

Напярэдадні выбараў

27 кастрычніка выбары да самаўрадаў. У Чаромсе, напрыклад, за пасаду войта будуць змагацца тры кандыдаты: цяперашні войт, мясцовы бізнесмен і радны апошняга склікання, асоба добра вядомая ў мясцовай грамадскасці. На каго і на што (якую праграму) будуць галасаваць чаромхаўскія выбаршчыкі пакуль-што невядома, паколькі прэтэндэнты на крэсла войта захоўваюць усё ў таямніцы. Адно думку войта Врублеўскага я пазнаў: „Выбарчых сходаў не буду арганізаваць, — канстатаваў, — сустракаўся я з насельніцтвам на сходах, калі прад'яўляў рэалізацыю бюджэту за мінулы год. Вядома ім, што я зрабіў. Паўтарацца не стану".

— Скажыце, калі ласка, а што зрабілі б вы будучы войтам? — пытаю Лявона Селяха, чаромхаўскага бізнесмена.

— Шанц для Чаромхаўскай гміны бачу вялікі. Перад усім — прыгранічны гандаль і наладжанне сяброўскіх кантактаў з бізнесменамі суседняй Беларусі. Чаромха карыстаецца чыгуначным і дарожным пагранічнымі пераходамі. Побач Полаўцаў знаходзіцца 36 гектараў, якія з'яўляюцца ўласнасцю Агенцтва скарбу дзяржавы (мяжуюць побач чыгуначнай лініі Чаромха — Брэст). Мой сябра з Бельска, які з'яўляецца прадпрымальнікам фірмы KREKS займаецца імпартам вугалю з Сібіры. Штомесячна прадае 20 тыс. тон апалу. Чаму ж бы гэты тавар не прапусціць праз Чаромхаўскую станцыю? Мне вядома таксама, што сябрук зацікаўлены імпартам штучных угнаенняў і шчэбеню з Украіны. Ад 1991 года чаромхаўская станцыя закрыта для гандлёвых мэт. Спатрэбілася б пахадайнічаць, каб адмяніць гэты закон і вярнуць Чаромсе міжнародны статус для таварнага руху. Гэта справа тычыцца і дарожнага перахода ў Полаўцах. Нашай гміне неабходныя месцы працы. А такі шанц бачу ў разбудове мытнікі і пагранічнай стражы. Ад Тарэспаля па Белую-Падляшскую я налічыў сорак мясных складоў. Чаму б не арганізаваць прыгранічнага гандлю? Але бяда ў тым, што мясцовы самаўрад і законы, на якія спасылаецца, тармозяць усялякія з гэтым звязаныя інвестыцыі. Пераканаўся ў тым я асабіста, арганізуючы гандлёвую фірму. Каштавала мяне гэта шмат часу, нерваў і грошай.

Зараз на маім участку змяшчаюцца тры гандлёвыя ўстановы, у якіх працуе 13 чалавек. А ўчастак займае ўсяго шаснаццаць сотак. А якую інвестыцыю можна збудаваць на 36-ці гектарах? Патрэбны для Чаромхі стратэгічны інвестар і адпаведныя законы. Няважна, хто ён будзе: немец, галандзец ці француз. Для чарамшан асноўнае — праца. І апошняя справа. Нявыкарыстаныя памяшканні Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу — быўшага паравознага і вагоннага дэпо. Калі не знойдзецца чалавек, які задбаў бы аб іх выкарыстанні, дык незадоўга пападуць у руіну. А ці можна дазволіць на такое марнатраўства пры ўваходзе ў Еўрасаюз? Мне здаецца, што прадпрымальнікаў губяць высокія падаткі. У выпадку Чаромхаўскай чыгункі спатрэбіўся б такі закон, які адмяніў бы задоўжанасць і дазволіў на ільготы на працягу прынамсі 5-10 гадоў. Ад мясцовага самаўрада многа залежыць. Хачу адно паказаць грамадскасці гміны, што ёсць яшчэ да выкарыстання магчымасці, якія нельга загубіць.

Уладзімір Сідарук

Да 120-годдзя нараджэння Якуба Коласа

Каласкі, каласочкі...

Мае мілыя качанчыкі...
Я. КОЛАС

У Коласа былі тры сыны: Даніла, Юрка і Міхась. Даніла нарадзіўся 30 верасня 1914 года ў Пінску, дзе бацькі настаўнічалі.

Юрка з'явіўся на свет увесну 1917 года ў г. Перм, дзе Колас служыў у 5-й роце 162-га запаснога палка. „Сярэдні мой брат Юрка быў маладзейшы за мяне больш як на два з паловай гады. Самыя першыя ўспаміны пра яго прыходзяцца яшчэ на цяжкі і галодны час знаходжання на Куршчыне". (У пачатку лета 1917 года Колас суправаджае жонку з дзяцьмі ў г. Абаянь Курскай губерні, дзе жылі яе маці і брат. Праз год сам прыязджае туды, каб настаўнічаць у вёсках).

Трэці каласок, Міхась, нарадзіўся ў студзені 1926 г. у Мінску, куды сям'я пераехала 15 мая 1921 года.

Данілу з юнацкіх гадоў прыцягвала хімія — „любоў вазіцца з доследамі, формуламі. Закончыў у Мінску хімпрафшколу, Белдзяржуніверсітэт, дзе потым працаваў выкладчыкам, вучыўся ў аспірантуры, пісаў кандыдацкую дысертацыю. Ды вайна ўсё перакрэсліла. Пасля яе заканчэння былі новыя планы, але цяга да гэтай прафесіі не знікла".

Працаваў у Інстытуце хіміі АН БССР вучоным сакратаром, пазней — загадчыкам лабараторыі. А 4 снежня 1959 года адкрыўся музей Я. Коласа, які ўзначаліў Даніла Канстанцінавіч.

— Памёршы на 82-м годзе жыцця, 40 год ён аддаў музейнай справе: „збіральніцкая, выставачная, прапагандысцкая дзейнасць спадчыны бацькі".

„А колькі зроблена па выяўленні асобаў з акружэння Коласа, сабрана рукапісаў яго лістоў. А будаўніцтва філіяла, аднаўленне тагачасных пабудоў на радзіме пісьменніка, устанаўленне мемарыяльных дошак звязаных з жыццём і дзейнасцю класіка беларускай літаратуры". Ён быў двойчы жанаты: першая жонка — Зарына Уладзіміраўна — выкладчыца французскай мовы. Другая — Ала Цімафееўна — географ-геолаг. Ад першага шлюбу — двое дзяцей, ад другога — дачка.

У 1994 годзе ў сувязі з 80-годдзем з дня нараджэння Даніла Міцкевіч быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны „За шматгадовую і бездакорную дзейнасць на ніве ўзбагачэння культуры".

Юрка Міцкевіч скончыў у 1940 годзе геаграфічны факультэт БДУ. Адразу быў прызваны ў Чырвоную Армію. Служыў у конным артылерыйскім палку, які размяшчаўся ў мястэчку Ставіскі за Ломжай (Беласточчына) на самай мяжы з Польшчай, акупаванай у той час гітлераўцамі.

Паколькі з юнацтва захапляўся паляваннем, у 1934 г. Колас купіў яму стрэльбу — дубальтоўку 12-га калібру фірмы „Заўэр". Праз год атрымаў у падарунак паляўнічую стрэльбу — дубальтоўку 16-га калібру. Неблагія вынікі па стральбе давалі магчымасць удзельнічаць у спаборніцтвах.

„15 чэрвеня 1941 года ў Мінску пачынаюцца рэспубліканскія спаборніцтвы па стэндавай стральбе. У спаборніцтвах прымае ўдзел сярод іншых і каманда Заходняй асобай ваеннай акругі. У склад гэтай каманды ўваходзіць і яфрэйтар Ю. К. Міцкевіч, які быў выкліканы з воінскай часці. Тут яго і застала вайна. 22 і 23 чэрвеня вайсковая камендатура, не ведаючы сітуацыі на фронце, патрабуе, каб ён неадкладна вярнуўся ў сваю часць. Але ж гэта немагчыма здзейсніць. Раніцаю 24 чэрвеня 1941 года ён ізноў ідзе ў камендатуру. Мы развіталіся з ім назаўсёды" (Даніла Міцкевіч).

Апошні ліст бацькі атрымалі ад сына 20 верасня 1941 года. А 30 верасня пачалося наступленне немцаў на Маскву. (Юрка ў той час ваяваў у 49-м карпусным артылерыйскім палку, які прымаў удзел у абароне Смаленска).

Пісьмы блізкіх вярталіся з прыпіскай: адрасат выбыў з часці...

Дагэтуль дакладна невядома месца, дзе знайшоў спачын гэты сумленны і адкрыты юнак, які ніколі „не цярпеў хлусні, фальшу, нячэснасці, мог проста і недыпламатычна выказаць свае думкі".

Малодшы сын Коласа, Міхась (на здымку), нарадзіўшыся ў студзені 1926 года, і сёння працуе Галоўным навуковым супрацоўнікам у Акадэміі навук у Мінску. Ён —



доктар тэхнічных навук. Мае трое дзяцей.

У свой час паэт прысвяціў яму паэму „Міхасёвы прыгоды". Варта адзначыць, што ўсе тры сыны Я. Коласа былі яго радасцю, яго надзеяй, яго духоўным апірышчам у жыцці, Дзе б ні быў, паэт слаў лісты сваім любым „качанчыкам":

„Ах, мой мілы Юрачка! Дай пацалую твае чорныя вочкі, твой лабок, твае губкі, што выказалі такую мілую, такую слаўную і шчырую прамову! „Няхай тату Бог пацалуе!" Калі вярнуся дадому, то ў Мінску куплю табе што-небудзь, бо ў Слуцку гола і пуста ўсякіх цацак. Пойдзем з табой у лес грыбы збіраць, возьмем таксама і маму, бо яна добрая, слаўная, мілая, харошая, праўда, сынок? Ну і Данілу возьмем, ён такі добры хлопец".

„А як гадуецца мой мілы Міхалёчак? Я часта думаю аб ім і чуць не кожную ноч сню яго. Цікава, ці пазнае мяне ён, як прыйду я дадому? Можа ён ужо гаворыць што-колечы".

„Як пажываюць мае мілыя Данік і Юрачка? Сыночкі мае! Будзьце разумнымі і сталымі членамі калектыву пана Тарбецкага, каб не было ў вас ніякіх стычак з Анцэвічамі. Калі будзеце добрымі хлопцамі, то прывязу вам гасцінцы".

„Цалую вас усіх моцна-моцна. Жывіце так, каб сэрца маё радавалася. Ваш бацька".

Такімі вось цёплымі і прачулымі былі адносіны вялікага песняра да сваіх сыноў. Яны адказвалі яму дабрынёй і ласкай.

Так і павінна быць у сапраўднай сям'і.

Тамара ЛАЎРЭНЧУК, г. Высокае

У дапамогу настаўнікам беларускай мовы

Сцэнарый урока беларускай мовы для I класа Гімназіі

Тэма ўрока: Багач — свята заканчэння ўборкі зерневых і пачатак азімай сяўбы.

Мэта ўрока: вучань знаёміцца з гісторыяй, традыцыямі свята „Багач", увасабляецца ў сваіх продкаў у гульнях, пажаданнях, прымаўках, загадках, шануе родавыя традыцыі, выказвае пашану да зямлі і да хлеба.

Абсталяванне: прыказкі з народнымі прыкметамі на сцяне, кошык з зернем і ўстаўленай свечкай, загадкі, прымаўкі пра хлеб, абаранкі для частавання, сноп збожжа, серп.

Форма заняткаў: праца калектыўная, індывідуальная, у групах.

Метады працы: гульня слоўная (гутарка).

Ход заняткаў

1. Удзельнікі свята ўваходзяць у хату з песняй „Дзе б ты не пасяліўся".

2. Прывітанне гасцей настаўнікам.

3. Расказ настаўніка пра свята ў мінулым (стар. 23 падручніка „Са спадчынай у будучыню" Тамары Русачык).

4. Вучань (Багач) віншуе ўсіх прысутных на ўроку.

а) пажаданні рознага характару: многа шчасця, здароўя, добрага ўраджаю, добрых ацэнак, вялікіх грошай і г.д.

Гульнёвая частка

5. Гаспадыня: Хто загадкі адгадае, той са мной і пагуляе.

а) Гарбаты дзядок усё поле аббегаў (серп).

б) Ляжыць мужычок у залатым каптане, сам устаць не можа, а людзі яго падымаюць (сноп).

в) На коніку сем саколікаў, кожны ў каптаночку (авёс).

г) Конь сталёвы, аўса не просіць, а арэ і косіць (трактар).

д) Жалезны конь, у жываце агонь, есці не просіць, а жне і косіць, па полю ўлетку паўзе, траву хутка грызе (касілка).

ж) Што гэта за машына, што разам жне і малоціць, а ідзе — ажно зямлю калоціць (камбайн).

з) Яго б'юць каламі, месяць, у печ саджаюць, рэжуць нажамі і ўсе яго любяць (хлеб).

(*Гаспадыня частуе абаранкам таго, хто адгадае загадку).*

6. Гаспадыня: Я прапаную гульню „Касьба". Уявіце сабе, што гэта поле (*выносяць ніць, на якую прывязаны каласкі*). Вам трэба будзе з заплюшчанымі вачыма „скасіць" каласок сярпом. Касіць будзеце адным махам (*з двух хлопцаў выбіраецца лепшага „касца"*). Гучыць песня „Пасеялі дзеўкі лён", пачастунак „касцоў" абаранкамі.

7. Гаспадыня: Мы зараз пагуляем у „Млын" (*дзеляцца на дзве каманды, першы бярэ каласок з падлогі перадае да апошняга над галавой, апошні наперад паміж нагамі, першы падае каласок з мяшочкам над галавой, апошні першаму паміж нагамі пакуль усе каласкі пакладзены ў мяшэчак не будуць перададзены; пачастунак усіх удзельнікаў*).

8. Гаспадыня: Усё святкаванне „Багача" было святасцю, выказваннем вялікай адказнасці, асобай пашаны да хлеба.

А ці ведаеце прымаўкі пра хлеб?

Я буду пачынаць прымаўку, а вы — працягваць.

а) Шмат снегу — шмат хлеба.

б) Не той хлеб, што на полі — а той, што ў клуні.

в) Едзеш на дзень — бяры хлеба на тыдзень.

г) Без хлеба няма абеду.

д) Хлеб не зяць — паглядзяць, з'ядзяць.

ж) Жывём — хлеб жуём.

з) Калі ёсць хлеб і вада, то не бяда.

е) Хлеб усяму галава (*пачастунак таму, хто працягне).*

9. Гаспадыня: Добра вы гуляеце, а цяпер паглядзім як спяваеце (*спяваюць песні, гаспадыня частуе абаранкамі).*

Заканчэнне

10. Гаспадыня частуе прысутных гасцей (бацкоў, дырэктара школы).

11. Ацэнкі настаўніка для выконваючых ролю Гаспадыні і Багача.

Дапаможнікі:

1. Падручнік для I кл. Гімназіі.

2. П. А. Гуд, „Ад Каляд да Пакроваў", Мінск 2002 г.

Апрацавала Яўгенія ТХАЖЭЎСКАЯ,
Комплекс школ з беларускай мовай навучання ў Орлі

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Калецтва

— З кім ты, мілы дружа, біўся? —
Запытаўся Яраслаў.
— У басейн я абваліўся
І руку там паламаў.

— Акалечыўся ў вадзе ты
І такая вось бяда?
— Ці ж я ўспамянуў аб гэтым,
Што ў басейне ёсць вада?

У рэстаране

Бацька з сынком знайшліся ў месце
І ў рэстарам прыйшлі паесці.
Нервуецца сыночак Ваня,
Доўга сядзяць у рэстаране.

— Чаму, — пытае бацька сына, —
На вешалку глядзіш няспынна?
— Куртку сваю пільную, тата,
Твой плашч забралі даўнавата.

Паўліна Ляўчук

Анэта Шыманюк

Марэк Лемеш

Свята Багача ў І класе Гімназіі ў Орлі

27 верасня І клас Гімназіі ў Орлі на ўроку беларускай мовы вельмі радасна і ўрачыста праводзіў свята Багача. Вучні вельмі рупліва — у нарыхтаванай і ўпрыгожанай імі зале — увасобіліся ў сваіх продкаў і паказалі гэтае свята так, як яго спраўлялі даўным-даўно. Урок, праведзены настаўніцай Яўгеніяй Тхажэўскай, быў прыкладам актыўнай працы вучняў.

У мінулым свята Багача людзі адзначалі тады, калі быў дажаты апошні сноп збожжа; яго ўрачыста прыносілі ў хату, а абмалочанае зерне сыпалі ў кошык і ўстаўлялі ў яго запаленую свечку ды спявалі зажытавую песню. Гэтак паўставаў Багач.

Паводле павер'яў, Багач забяспечваў усіх людзей дабром і шчасцем, меў даць дастатак у хаце і добры ўраджай у наступным годзе. Багача абносілі з двара ў двор, да кожнага гаспадара — з пажаданнямі. Затым выходзілі з ім у поле, на луг, абыходзілі сагнаны на выган статак.

„Прыйшоў Багач, кідай рагач (саху), бяры сявеньку, сей памаленьку". На Багача да ўсходу сонца гаспадар засяваў ніву жытам. Свята праводзілася да 21 верасня, да Прачыстай.

У свята, даўным-даўно, людзі весяліліся, гулялі — і ўсё гэта паказалі вучні І класа Гімназіі ў Орлі. У зале парты былі адсунуты пад сцены. Каля дошкі на дзвюх лаўках стаяла ў кошыку збожжа, побач ляжалі два сярпы, а ў талерцы шакаладныя пернікі. Настаўніца запаліла заткнутую ў збожжа свечку. Сыграць ролі гаспадароў згадзіліся выдатнікі: Марэк Лемеш і Наталля Жураўль, якая апранула на свята народны беларускі ўбор. Ролю Багача Яўгенія Тхажэўская даверыла Марку, бо ён багаты хлопец, у ягоных бацькоў у Кашалях многа збожжа; дарэчы, ён і прынёс збожжа для патрэб пастаноўкі.

Пачаліся пажаданні. Першыя атрымаў карэспандэнт „Нівы": шчасця, здароўя, багацця і добрых артыкулаў. Сваім сяброўкам Марэк жадаў шчасця, здароўя, багацця, добрых ацэнак і поспехаў у школе, каб сустрэлі добрых хлопцаў... А адной дзяўчыне пажадаў, каб купіла ракету і паляцела ў космас. Пажаданні падабаліся, асабліва тыя, у якіх гаварылася пра многа грошай. Кожны госць атрымліваў смакавіты ласунак.

Пачаліся гульні. Наталька з памяці загадвала беларускія загадкі, а хто першы адгадаў, той атрымліваў абаранак. Найбольш цяжкасцей даставіла загадка пра хлеб: яго б'юць каламі, саджаюць у печ, рэжуць нажом і ўсе яго любяць. Затым дзеці гулялі ў гульню „касьба". Вучні Павел Бурак з Пашкоўшчыны і Марэк Лемеш з Кашалёў былі касцамі: на нітцы былі прывязаны каласкі і з заплюшчанымі вачамі каласкі трэба было скасіць сапраўдным сярпом. „Касілі" наперамен; больш каласоў скасіў Марэк, бо ён вышэйшы ростам. Наступнай гульнёй быў „млын". Вучні падзяліліся на дзве каманды. Першы з каманды браў каласок з падлогі і перадаваў яго над галавой, пакуль каласок не дайшоў да апошняга. Апошні зноў перадаваў, але цяпер ужо паміж нагамі; першы клаў каласок у мяшочак.

Удзельнікі гульні атрымалі ў дзённік пяцёркі і шасцёркі; яны выдатна карысталіся беларускай мовай, асабліва тыя, што выступілі ў ролі гаспадыні і гаспадара. Урок быў прыкладам актыўных заняткаў па рэгіянальнай тэматыцы. Урок узбагаціў веды вучняў пра колішняе свята Багача, пазнаёміў з народнымі восеньскімі прыказкамі, прыгадаў традыцыі нашых продкаў, вучыў пашаны да хлеба, да другога чалавека.

Урокі беларускай мовы ў арлянскай гімназіі, дзякуючы настаўніцы Яўгеніі Тхажэўскай, цікавыя і карысныя, заахвочваюць вучняў да навучання роднай мовы. У першым класе гімназіі з ліку 24 вучняў 11 вывучае беларускую мову. Выдатнікамі з'яўляюцца Наталля Жураўль і Марэк Лемеш. Добра вучацца Паўліна Ляўчук і Анэта Шыманюк, а іншыя вучні таксама стараюцца не адставаць ад іх.

Міхал Мінцэвіч

Дзённік Міколы

Кацячая вайна

Яшчэ ў той самы дзень у нашай камяніцы пасялілася спадарства Ліняцкія. У час, калі яны зносілі мэблю, я прыкмеціў, што Чорны кот ускочыў у шафу з прыадчыненымі дзвярыма. Гэтае ж самае згледзіў і Ярак, але ён, як і я, не хацеў пра нішто гаварыць Ліняцкім, бо яшчэ звар'яцелі б! Тады я мігам пабег да мастака Нор Узі і расказаў, што ўбачыў.

— Міколка! — супакоіў мяне мастак. — Раскажу табе яшчэ адну гісторыю пра гэтага ката. Толькі глядзі... Яна не менш жахлівая за папярэднюю.

— Нічога, — заўпарціўся я, — мне мусова разблытаць гэтую чорную загадку.

Я думаў, што Чорны кот для мяне і маіх сяброў ужо не загадка, аднак мы памыляліся. Мастак Нор Узі не сказаў нам усяго; ён думаў, што мы спалохаемся і перастанем гуляць. Аднойчы ноччу Чорны кот хадзіў па ўсходах у нашым пад'ездзе і жахліва выў. Так-так... ён выў! Кот не ўмеў мяўкаць; у часы, калі быў яшчэ папугаем, ён паўтараў кожны гук, ніколі аднак не навучыўся мяўкаць.

— Было так, — мастак суцішыў голас, — пасля смерці майго брата яго кот пасяліўся ў мяне. Я не прадбачыў, што ён навалачэ на мяне такую процьму праблем. Я мучыўся некалькі тыдняў... І ў канцы здаўся. Я занёс яго пані Іаланце Дрот, кабеце з суседняй камяніцы, а яна ўзамен абдаравала мяне сабакам, з якім я не ведаў, што рабіць і ў зручны момант аддаў свайму калегу... А мой калега, каб не быць у даўгу, падарыў мне Чорнага ката. Чыстае вар'яцтва, кажу табе! Год таму, як, пэўна, памятаеш, памерла спадарыня Дрот і гэты Чорны кот з белым хвастом вярнуўся зноў да мяне. Два Чорныя каты зненавідзелі сябе, безупынна дзерліся, і ўперамешку мяўкалі ды вылі. У рэшце рэшт я не сцярпеў гэтай катавасіі і забіў братавага ката. Зрабіў вялікае глупства, — кот ажыў і стаў яшчэ горшы. Ён намерыўся зрабіць са мной тое ж самае... што я з ім!

— Жах! — ускрыкнуў я. — Скажыце, што сталася з гэтым другім катом?

— Бедалажка, трапіў пад машыну, на якой ехала твая цёця Ліза.

— Цёця Ліза? Чаму толькі цяпер я гэта чую?

— Відаць, твае бацькі палічылі, што гэтая вестка цябе не ўсцешыць. Дзецям, дарэчы, не пра ўсё трэба ведаць!

Нор Узі гаварыў мне адно, а я адчуваў, што за словамі мастака прыхаваная яшчэ не адна гісторыя.

(працяг будзе)

(нак-с)

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Захоп Беларусі Расіяй

Пад прымусам чужынцаў

На захопленых землях царскія ўлады ўводзілі свае парадкі.

Імператрыца Кацярына II і яе сын Павел раздалі паўмільёна беларускіх сялян сваім памешчыкам. Прыгнёт у Расійскай імперыі быў больш цяжкі. Раней прыгонныя сяляне разлічваліся са сваімі гаспадарамі грашыма. Цяпер яны мусілі ледзь не кожны дзень ад світання да змяркання працаваць на панскім полі.

У беларускіх гарадоў адабралі ўсе даўнейшыя правы і вольнасці. Каб хутчэй сцерці памяць пра той час, калі наша Бацькаўшчына была незалежная, новая ўлада забараніла нават старадаўнія гербы.

Падаткі на беларускіх землях былі ў пяць разоў цяжэйшыя, чым на расійскіх. Маладых здаровых мужчын пад прымусам забіралі ў царскую армію. Родныя развітваліся з імі так, быццам праводзілі на той свет, бо салдаты павінны былі служыць цару ўсё жыццё. Потым гэты тэрмін зменшылі да дваццаці пяці гадоў, але пасля такой доўгай службы ўсё роўна амаль ніхто не вяртаўся дадому жывы.

Царскія ўлады не прызнавалі беларусаў за народ і змагаліся з нашай мовай. Вучыцца на ёй было забаронена. Нашых продкаў пазбаўлялі права нават на свае імёны і прозвішчы. Адразу пасля захопу ўсходніх беларускіх земляў царскія пісарчукі перарабілі Міхасёў у „Михайлов", Язэпаў у „Иосифов", а Тамашоў у „Фомы". Жукі ператварыліся ў „Жуковых", Кавалі — у „Ковалевых"...

Новыя гаспадары ўчынілі з паняволенага народа яшчэ адзін здзек. Большасць беларусаў была тады вуніятамі, якія добра ведалі, што яны не расіяне і не палякі. Каб хутчэй ператварыць беларусаў у расіян, царская ўлада забараніла народную вуніяцкую веру, якая была апірышчам беларускай мовы.

Тых, хто не хацеў ісці да праваслаўных царскіх папоў, усяляк каралі і часам збівалі да смерці. У адной з тагачасных газетаў расійскі пісьменнік Аляксандр Герцэн расказаў пра выпадак, калі хлопчыку-вуніяту, які адмаўляўся прыняць чужую веру, царская паліцыя загадала даць дзвесце бізуноў.

Трапіла пад забарону не толькі беларуская мова, але і сама назва Беларусь. Адмысловым указам цар загадаў ва ўсіх дзяржаўных дакументах называць нашую Бацькаўшчыну „Северо-Западным краем". Расійскія ўлады хацелі, каб беларусы забылі пра сваю былую незалежнасць. Каб забылі нават найменне сваёй зямлі.

Але беларусы не змірыліся з чужынскім панаваннем.

На працягу няпоўных ста гадоў пасля захопу Беларусі нашы вальналюбныя продкі тройчы браліся за зброю, каб вырвацца са смяротных абдымкаў царскай імперыі.

Першым у гэтай барацьбе было паўстанне Тадэвуша Касцюшкі, пра якое пойдзе гаворка ў наступным апавяданні.

Знайшлі некалькі пудзілаў...

Калі будзе апошні раз!

Кожны год, калі прыходзіць восень або вясна, вучні нашай школы адпраўляюцца на вялікае прыбіранне.

20 верасня 2002 года ўсе вучні і настаўнікі зноў узялі рукавіцы, вялікія мяшкі і пайшлі наводзіць парадкі. Апрача таго кожны з нас узяў з сабою добры гумар. Ён быў патрэбны, каб можна было пасмяяцца з таго, што знайшлося, бо знайсці можна ўсё — ад пластмасавых бутэлек да канапы.

У прыбіранні свету многа плюсаў: дыхаем свежым паветрам, прыбіраем, а яшчэ папраўляем сваю кандыцыю і пазнаем ваколіцу.

Вучням VI класаў дапісваў гумар, тым больш, што чакала нас вогнішча. На маршруце, які мы прыбіралі, знайшлі некалькі пудзілаў. Добра было б пастрашыць імі тых, хто засмечвае.

А можа ў наступным годзе на вялікае прыбіранне разам з вучнямі з усіх школ адправіліся б і ўсе дарослыя?

Вучні VI „а" і „б" класаў з Нараўкі

Як паўстала вёска Гацькі

Даўно-даўно, на высокай гары стаяў вялікі замак, у якім жыў злы пан. Называлі яго Гаць. Часта на гару прыходзіла жанчына з дзяўчынкай, каб памаліцца ў замкавай капліцы. Не спадабалася гэта жорсткаму пану і ён забараніў ім прыходзіць на малітву. Калі засмучаная жанчына вярталася дамоў, дзяўчынка спатыкнулася, упала ў ваду і ўтапілася. Жанчына ў роспачы праклала пана і яго замак ды і сама кінулася за дачкой у ваду.

Праз тыдзень ад гэтага здарэння над гару нацягнула бура. Пацямнела, загрымела і вялікі замак разам з яго благім гаспадаром абрынуў пад зямлю. Пасля гэтага каля гары пабудавалася вёска, якую назвалі Гацькі, а гару называюць Замкавай гарою.

Анна Шэшка,
I „ц" кл. Гімназіі ў Аўгустове

Камень

Ля звілістай дарогі ў суседнюю вёску ляжаў напалову ўрослы ў зямлю камень. Цікава — адкуль такі ўзяўся: шэры, з ружовымі пражылкамі, са срэбнымі бліскаўкамі, чорнымі і зеленаватымі крапінкамі, калі наўкола — пясчаная нізіна з упадзінамі, дзе-нідзе — пакаты пагорак. Побач гэтага каменя найменш два разы ў дзень праязджаў на ровары Міхалка — у школу ды назад, і часта затрымліваўся побач, апіраўся аб яго, і ўзіраўся на ўзоры мазаікі розных парод, якія прырода ўкачала ў валун.

— Гэты валун — волат! — сказаў Міхалку прадзед Костусь.

— А скуль ён тут узяўся?

— Прыкаціўся.

— Ты што, дзедка! Ён жа ж нерухомы. І цяжкі! Бачыш, урос у зямлю.

— Урос, бо доўга ён тут ляжыць.

— Доўга? Так доўга, як ты жывеш? Пэўна, памятаеш, як сюды прыкаціўся.

— Ніхто з нас гэтага не памятае. Ніхто з людзей. Гэта з ледавіком з поўначы ён прыйшоў.

— Дык адкуль людзі ведаюць?

— З навукі.

— Дык ёсць навука і пра камяні?..

Расказаў дзед Костусь і пра геаграфію, паказваючы Міхалку, адкуль ледавік ішоў. „Геа" — значыць, зямля. Гэта першая частка складаных слоў, якая абазначае: звязаны з зямлёй, з навукай аб Зямлі. А ёсць і такія навукі: геахімія, геадэзія, геафізіка, геабатаніка...

— Геалогія — навука аб будове зямной кары, аб пошуках радовішчаў карысных выкапняў.

— А наш камень карысны? Ляжыць сабе... А гэтыя крамяні, якіх поўна на полі?

— Гэта вельмі цвёрды камень, які першапачаткова ўжываўся для высякання агню. З чаго, пытаешся, складаецца? З крэмнію, як большасць такіх парод. Ды сярод такіх камянёў не толькі крэмень, а і кварц, і аметыст, і горны хрусталь...

— У цёці Юлі ёсць пярсцёнак з аметыставым вочкам, і глыба горнага хрусталю, ды яны ж празрыстыя! Зусім да нашага каменя непадобныя!

— А на крэмнію апертая ўся сучасная навука, камп'ютэры...

Міхалка, едучы са школы ўжо амаль на прыцемках яшчэ раз затрымаў свой веласіпед каля маўклівага валуна. А ноччу прысніўся яму ледавік. Ён упарта сунуўся з поўначы, засыпаў даліны старажытнымі сваімі дзяцьмі.

Міра Лукша

Польска-беларуская крыжаванка № 42

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 38: Круг, рант, грунт, здымак, асака, банан, соска, мак, торт. Код, аблом, Гданьск, рыса, гуманіст, рынак, ткач, ар, гарызонт.

Узнагароды, **пісьмовыя наборы**, выйгралі: **Наталля Такаюк** і **Паўля Вітальеў** з Орлі. Віншуем!



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пераможцы фатаграфічнага конкурсу

Фатаграфіі з парку

Ад верасня можна глядзець фатаграфіі вучняў Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, якія знаходзяцца на пасляконкурснай выстаўцы ў школьнай галерэі. Другі выпуск фатаграфічнага конкурсу „Беларускі нацыянальны парк у маіх вачах" звязаны быў з васьмідзесяцігоддзем існавання БНП і годам нацыянальных паркаў на свеце. У конкурсе, які завяршыўся яшчэ ў мінулым навучальным годзе, прынялі ўдзел каля 30 белгімназістаў і белліцэістаў. Фатаграфавалі яны краявіды і раслінныя дэталі, звяртаючы ўвагу на адметнасці ў прыродзе. Камісія, якую сабрала намеснік дырэктара Аляксандр Лаўрыновіч, настаўніцы Аліна Пліс, Бажэна Ляўчук і мастак Віктар Кабац першае месца сярод ліцэістаў прысудзіла Малгажаце Карпюк, другое — Міхалу Андрасюку, а трэцяе — Зосі Лемеш. У групе гімназістаў першае месца заняла Юстына Казмерчак, а аўтары іншых найпрыгажэйшых фатаграфій атрымалі вылучэнні.

— Калі моладзь фатаграфуе, мае яна кантакт з прыродай. Сёлета вучні выканалі шмат мастацкіх фатаграфій, — заявіла арганізатар конкурсу, настаўніца біялогіі Аліна Пліс.

Настаўніца Аліна Пліс намерваецца арганізаваць міжшкольны фатаграфічны конкурс.

Аляксей Мароз

Паўла Каэльо на Грабарцы

Зорка сусветнай літаратуры, Паўла Каэльо (Paulo Coelho), ад гадоў падарожнічае па месцах праўды.

3 кастрычніка г.г. бразільскі пісьменнік наведаў Святую Гару Грабарку.

— У гэтым месцы я адчуў ласку Божай Маці. Мая малітва была тут вельмі інтэнсіўнай і глыбокай, — сказаў на прэс-канферэнцыі П. Каэльо.

Аўтар культавых кніжак „Алхімік", „На беразе ракі Піэдры прысеў я і плакаў", „Вераніка вырашае памерці", „Дэман і панна Прым" кранае адвечнае пытанне Дабра і Зла. Даказвае, што чалавек ад пачатку існавання прысуджаны на змаганне святла і цемры, на вайну між анёламі і дэманамі. Ад яго адвагі і маральнасці залежыць перавага дабра або зла ў жыцці. У прозе, якая звяртаецца „да сэрца", немагчыма прадбачыць дзеянне ні канчатковы эфект, чытач мае ўражанне, што лёс героя не вырашае аўтар.

Паўла Каэльо нарадзіўся ў 1947 годзе ў Рыо-дэ-Жанейра. Сёння лічыцца найбольш папулярным пісьменнікам у сусвеце. У апошнія гады выдавецтвы прадалі 37 мільёнаў яго кніжак, на 56 мовах свету, у 140 краінах.

П. Каэльо наведаў Польшчу ў сувязі з прэзентацыяй перакладу ягонай кніжкі „Дэман і панна Прым".

Грабарка захапіла пісьменніка сваёй духовасцю і ціхай непрыкметнасцю сярод восеньскіх краявідаў Падляшша.

Ганна Кандрацюк

Дзень сеніёра

20 кастрычніка г.г. (нядзеля) Гміннае праўленне Польскага саюза пенсіянераў у Нараўцы ладзіць святкаванне Дня сеніёра. Адбудзецца яно ў кавярні мясцовага Гміннага асяродка культуры.

Сеніёрам спяваць будуць стараляўкоўскія „Цаглінкі" ды выступяць з адмысловай праграмай нараўчанскія дзеці. Вучні 0-VI класаў рыхтаваліся да свайго выступлення ад палавіны жніўня. Тэкст спектакля напісала старшыня Гміннага праўлення ПСП Ядвіга Карпюк. Падчас святкавання Дня сеніёра адбудуцца конкурсы і фантавая латарэя, а таксама танцавальны вечар. Дзеці ўручаць сеніёрам віншавальныя лісты.

Пачатак мерапрыемства ў 16^{00}. (яц)

Цэнтр культуры ў Міхалове запрашае

Гмінны цэнтр культуры, спорту і адпачынку ў Міхалове запрашае школьную моладзь на заняткі ў гуртках зацікаўленняў, між іншым, у пластычным гуртку (заняткі з інструктарам адбываюцца ў аўторкі, серады і ў пятніцы ад 17 да 19 гадзіны), у музычным гуртку (навука спявання і ігры на музычных інструментах, у тым ліку на ўдарных).

У чацвяргі ад 17 гадзіны ў цэнтры культуры ладзяць сустрэчы сябры Клуба сеніёра. (яц)

Беларускі дзень у Гдыні

На нядзелю, 6 кастрычніка, у Гдыню заехалі бельская „Маланка" з кіраўніком Сяргеем Лукашуком і Сакрат Яновіч з Крынак. Меўся быць прыгожы восеньскі, беларускі дзень у Гдыні. Сарганізаваў яго прыхільнік беларусаў, віцэ-прэзідэнт гэтага горада Марэк Стэмпа. Былі надрукаваны лістоўкі пра мерапрыемства, рэкламавалі яго па радыё і ў газетах. Сваімі каналамі распаўсюдзілі вестку тутэйшыя беларусы. Вісела аб'ява пры царкве. Здавалася б усё зроблена як паложана ў арганізацыйным плане. Але падвяло восеньскае надвор'е — у нядзелю ад раніцы ліў дождж. А канцэрт „Маланкі" быў запланаваны пад адкрытым небам, каля Музычнага тэатра на 13^{30}, якраз калі людзі выходзяць з касцёла. Марку Стэмпу прыйшлося стаяць на дажджы, перапрашаць публіку за надвор'е і запрашаць у Гарадскі тэатр, дзе ў 16^{00} гадзін мела адбыцца сустрэча з Сакратам Яновічам на тэму „Польшча вачыма беларуса".

У фае Гарадскога тэатра беларускі падвячорак пачаўся з выступу „Маланкі". Пры століках сабралася каля 50 асоб, у большасці мясцовых беларусаў. Прыйшлі таксама нашы польскія прыхільнікі — Ганна Сабэцкая, Анджэй Васькевіч, Курыловічы (бацька і сын), Марэк Рэдзімскі і каля дзесятка невядомых мне асоб. Віцэ-прэзідэнт Гдыні Марэк Стэмпа прадставіў „Маланку", якой ужо 12 гадоў і расказаў пра Бельск як самы старажытны горад на Падляшшы. Замест двухгадзіннага канцэрта пад адкрытым небам атрымаўся паўгадзінны ў прыцемненым фае. У прысутных астаўся недахоп беларускіх песень, таму нягледзячы што пачаў сваё выступленне Сакрат Яновіч, многія рынуліся за „Маланкай", каб купіць іхнія касеты і дыскі. А Сакрат, як заўсёды, інтрыгаваў палякаў, гаворачы пра беларускамоўных Ягелонаў, вышэйшасць беларускай культуры над польскай ды ў канцы пра паралельнасць польскай і беларускай літаратур у Польшчы. Паколькі ўсё выказванае адпавядала публіцы, інтрыга не ўдалася. А думаю, што Сакрат многім звярнуў увагу на тое, што двухкультурнасць гэта еўрапейскасць, а „Polacy skazani są na jedną kulturę". Але пры тым усім найбольш гаварыў пра беларускі комплекс у адносінах да Польшчы і палякаў, хамскасць адных і панскасць другіх. Пра ўніверсальную „супольнасць хлеба" і яе ўплыў на асіміляцыю беларусаў, пра іх зайздрасць з прычыны польскага шляхецкага лёсу. Сакратавы арыгінальныя выказванні, жывая мова (хаця польская) з многімі эпітэтамі і метафарамі былі даспадобы публіцы, якая прыйшла менавіта паслухаць літаратара. Пасля паўтарагадзіннага маналога, калі першыя асобы выйшлі з тэатра, Сакрат Яновіч знайшоў зручную прычыну для заканчэння сустрэчы. Хаця ведаю, што многія маглі б слухаць яго без канца. Але чакала вячэра і Музычны тэатр, куды гаспадары запрасілі Сакрата Яновіча на прэм'еру амерыканскага мюзікла „Чыкага" на аснове п'есы Марын Далас Уоткінс пра забойства, карупцыю, насілле, здраду і славу ў найбольш дэправаваным амерыканскім горадзе ў 1920-я гады.

Лена Глагоўская

PS. Зусім выпадкова ў Гдыні атрымалася беларуская дэкада. Незалежна ад успомненых мерапрыемстваў з 1 па 10 кастрычніка ў ліцэі айцоў езуітаў можна было паглядзець фатаграфічную выставу пра Беларусь, якая раней экспанавалася ва ўправе горада Сопата. На гэты раз выставу запрасіў да сябе дырэктар ліцэя айцец Войцех Жмудзінскі, родам з-пад Крынак.

Фільмавы вечар

Кастрычнік з яго зменным надвор'ем, каляровымі лісцямі ў парках спрыяе сямейным шпацырам. Пры нагодзе заахвочваю наведаць кінатэатр. А варта! Сёння прапаную тры фільмы.

„Неба" ў рэжысуры Мона Тыквера гэта гісторыя маладой настаўніцы англійскай мовы, якая падымаецца на барацьбу за справядлівасць і шчасце сваіх вучняў. Філіпа — тут на экране пабачым Кэйт Бланшэт, падкладае бомбу ў кабінеце шанаванага бізнесмена, які ў сапраўднасці ўзначальвае наркамафію. Жанчына нядаўна пахавала свайго мужа-наркамана, і цяпер бачыць, што ахвярамі бізнесмена становяцца яе вучні. Замах, аднак, не ўдаецца. Бомба забівае нявінных людзей. Пачынаецца следства. Малады паліцыянт улюбляецца ў падазроную і рашае дапамагчы ёй ва ўцёках. Ці гэта ўдасца? Варта даведацца. На экране пабачым яшчэ Джавані Рыбізі і Стэфанію Рока. Аўтарам сцэнарыя з'яўляецца Кшыштаф Кяслёўскі — а гэта найлепшая рэкамендацыя фільма!

„У цяні сонца" гэта бразільска-французска-швейцарская прадукцыя ў рэжысуры Уольта Сэйлса спадабаецца як аматарам баевікоў, так і рамантыкам.

Дзея адбываецца ў Бразіліі, дзе амаль два стагоддзі бедная сям'я вядзе спрэчку з багатымі суседзямі за кавалак зямлі. Канфлікт гадамі перамяніўся ў жахлівы рытуал. На змену абедзве сем'і забіваюць сваіх сыноў, прыносяць у ахвяру сваіх дзяцей і змяніць гэтага ўжо немагчыма, бо, як гавораць героі, астаўся ім толькі гонар!

Надзея на адмену „традыцыі" — пазіцыя маладога Пацу, які як адзіны бунтуецца супраць жахлівай традыцыі. Памагае яму ў гэтым з'яўленне вандроўных цыркачоў. Ці мастацтва паможа знайсці дарогу да нармальнага жыцця, да кахання? Што абазначае свабода, незалежнасць? Як успрымаць свет? Адказы на гэтыя пытанні знойдзеце напэўна пасля сеанса ў кінатэатры.

Наканец прапаную польскі фільм „Гакер" Януша Заорскага. Гэта гісторыя аб моладзі, якая хоча выгодна жыць, карыстаючыся ўсімі магчымымі сродкамі. Двое сяброў — Турбо і Мак Флай займаюцца раскрываннем камп'ютэрных забеспячэнняў. Наймаюць яны паверх Палаца культуры ў Варшаве, не плацячы пры гэтым ні залатоўкі, уводзяць замяшанне на ўрадавых вэб-старонках, а ўсё гэта дзеля гульні.

Усё змяняецца, калі Марцін, інакш Мак Флай, пазнае Лаўру, і калі варшаўскія мафіёзі пастанаўляюць пакарыстацца ўмеласцямі хлопцаў.

У галоўных ролях пабачым Барташа Абуховіча, Пётра Мязгу, Кацярыну Смутняк, Багуслава Лінду і Марка Кондрата — а гэта абазначае, што варта пайсці ў кіно!

Паўліна Шафран

Камяні Уладзіслава Сыракомлі

У Стоўбцах ніхто не ведаў пра Уладзіслава Сыракомлю.

— Здесь такой не живёт! — чуўся адзін адказ.

На карце мы адшукалі Тулёнку і Жукаў Барок і, каб не губляць час, рушылі ў дарогу.

У Тулёнцы таксама нічога не ведалі і не чулі. Мы збянтэжыліся, бо паводле гістарычных звестак, адсюль у Залучча адна міля (менш чым два кіламетры).

— Пайшлі, папытаемся ў дзядзькі Сашы, — прыдумала спатканая ў магазіне цётка. — Ён у нас найстарэйшы, можа, што памятае.

Старажыл доўга не адчыняў дзвярэй, але нашая апякунка ведала мясцовыя звычаі і не здавалася:

— Дзядзька Саша, адчыніце! Не бойцеся... Гэта не немцы! — ламатала ў дзверы, пасля ў акно. — Гэта свае людзі, адчыніце!

* * *

Аляксандр Анікійчык не спадзяваўся, што будзем пытаць пра маёнткі і паноў. Ён, ветэран, ахвотна раскажа нам пра партызаншчыну.

— Пра Сыракомлю або Кандратовічаў чулі?

— Такіх у нас не было.

— Яны, калісьці, мелі маёнтак у Тулёнцы.

— Не памятаю.

— Пра маёнтак Залучча вы чулі?

— Не чуў.

Старажыл запамятаў адно асадніка Кота, і яго сыноў Рома і Рэма. Пасвіў у іх кароў пры Польшчы. Дзядзька Анікійчык пражыў восемдзесят два гады.

— За работай не было як цікавіцца гісторыяй, — кажа на развітанне. — І за Польшчы, і за Сталіна, і за камуністаў. Ніколі не было толку.

— А цяпер?

— Калгаснікі пасадзілі плытка бульбу і ўся засохла, — махае рукой.

* * *

Замест каменціраваць гістарычную бяспамяць Тулёнкі, мы падаліся ў Жукаў Барок. На месцы даведаліся, што Залучча не існуе.

— Цяпер там стаіць камень, — кажа Валянціна Навіцкая, былы культработнік. Пані Валянціна працавала загадчыцай дома культуры, ды не толькі:

— І свінаркай рабіла, і культработнікам, — пералічвае прафесіі і глядзіць на гадзіннік. Цяпер працуе ў мясцовым калгасе „Красны Партызан". Праз гадзіну ёй трэба праверыць рабочых, і гэта абазначае, што маем шчасце: яна асабіста пакажа нам усе цікавыя месцы.

У Жукавым Барку мы выклікалі сенсацыю. Наш самаход „Ambulans" акружылі вяскоўцы. Усе хацелі нам дапамагчы.

— Жэнік, бяжы па настаўніка! — гукнулі ў грамадзе, калі спыталіся мы пра гісторыю вёскі.

Настаўніка не было ў хаце, але мы адчулі, што справа пайшла ў добры бок.

* * *

Да Уладзіслава Сыракомлі (Людвіка Кандратовіча) мы прыехалі з мэтай адзначыць 140-годдзе смерці паэта, вядомага ў Польшчы як „літоўскі лірнік вясковы". Сыракомля быў прадстаўніком рамантызму. Пісаў на польскай і беларускай мовах. Даследчыкі лічаць яго пачынальнікам новай беларускай літаратуры. Залучча ў палове XIX стагоддзя лічылася меккай ідэалаў і мастацтва. Сюды прыязджала студэнцкая моладзь, літаратары, філосафы і мастакі. Сакратаром „лірніка" быў не хто іншы, як Вінцэсь Каратынскі. У Жукавым Барку жыў Антон Пяткевіч, вядомы ў літаратуры як Адам Плуг.

Атачэнне асобы Уладзіслава Сыракомлі арыентавалася на інтэлектуальную традыцыю Вялікага княства Літоўскага, сваім дзеяннем яно спрычынілася да ўзнікнення новай беларускай літаратуры, падрыхтавала грунт для літаратурнага феномена Якуба Коласа і Янкі Купалы.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Валянціна Навіцкая (справа) ды Юля і Жэнік Скорбіжы ля мемарыяльнага каменя ў гонар Уладзіслава Сыракомлі

* * *

Маёнтак Пяткевічаў знаходзіўся недалёка за вёскай, над берагам Нёмана. Сёння захаваўся адзін каменны млын. За Шушкевіча, як сказала нам спадарыня Навіцкая, многа рабілі для беларускай культуры. Тады менавіта паставілі камяні з надпісамі. У Жукавым Барку камень з беларускім надпісам: *Ваколіцы Жукавага Барка радзіма філосафаў Саламона Маймана (1753-1800), Юзэфы Кодзіс (1865-1940), мясціна натхнення паэтаў Уладзіслава Сыракомлі (1823-1862), Адама Плуга (1823-1903), Вінцэся Каратынскага (1831-1891).*

Жэнік Скорбіж, вучань восьмага класа Пачатковай школы ў Аталезі цікавіцца мінулым сваёй вёскі. Разам са сваячкай Юляй з Мінска і Валянцінай Навіцкай завезлі нас у Залучча. У былы маёнтак Сыракомлі мы ехалі лясной пясчанай дарогай. Тут, кіламетр ад вёскі, сярод маладняку, стаіць камень з табліцай:

У гэтай мясцовасці знаходзіўся фальварак Залучча, дзе ў 1844-1852 гг. жыў вядомы польскі і беларускі паэт Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч).

Далей, сярод калгаснай пожні, мы знайшлі камяні і кусты бэзу.

— Калісьці было тут Залучча, — апусціла рукі пані Валянціна.

* * *

Астаўся краявід, шырокая панарама на Нёман і даліну. У паветры лунаў смак меланхоліі і тугі. Рамантычныя творы Сыракомлі як падыктаваны рытмам тутэйшай зямлі. Паэт апяваў сялянскі духовы свет, запісваў легенды і былі свайго люду. Тут у 1844 годзе напісаў „Паштальёна", якога спявала пасля ўся Расія („Калі я на пошце служыў ямшчыком"). Тут прайшлі самыя творчыя гады паэта і напаткала сямейнае гора, — памерлі трое дзяцей.

Залучча, паводле ўспамінаў тадышніх падарожнікаў, было маёнткам без гаспадара. Маёнтак пераходзіў з рук у рукі арандатараў. Сыракомля прыдбаў месцу славу і вядомасць, аднак, пасля сямейных трагедый, з'ехаў на Віленшчыну, дзе памёр на 39 годзе жыцця. У Барэйкаўшчыне, як завецца апошні маёнтак паэта, сёння працуе музей. У недалёкім Нясвіжы яго імем названа вуліца, на Беласточчыне — школа ў Міхалове.

А ў Аталезі, ля дома культуры, які будавалі з раскінутай у Жукавым Барку царквы, стаіць манумент Авакуму Мамантаву:

Секретарь Столбцовского подпольного районного комсомола — чытаем пад помнікам. Пра гэтага героя ведаюць усе — і ў Стоўбцах, і ў Тулёнцы.

Ганна Кандрацюк

PS. На табліцы прысвечанай Сыракомлі Залуча напісана з двума „ч", у даведніках і літаратурных нарысах — з адным.

Прызабыты ваенны герой

У цэнтры Гайнаўкі, на скверы каля гандлёвага павільёна, стаіць каменны абеліск са сталёвай таблічкай, запраектаванай Віктарам Кабацам, прысвечанай салдату верасня 1939 года.

— Пасля вайны, — кажа Віктар Кабац, — пры г.зв. камуне, у Гайнаўцы царыла ўражанне, што на гэтай тэрыторыі Польскае Войска не змагалася і не было тут ад яго ніякіх герояў; даваенныя героі бачыліся адмоўна. Адліга наступіла пасля ўзнікнення ў горадзе „Салідарнасці" і ў сілу рашэння Гарадской рады вырас абеліск.

На абеліску віднее надпіс, быццам пісаны непаваротлівай рукою: „Pamięci bohaterskiego obrońcy Hajnówki przed najazdem hitlerowskim w 1939 roku plut. Bolesława Bierwiaczonka odznaczonego dwukrotnie Krzyżem Walecznych d-cy ce-ka-emu podczas walk 3 pułku strzelców konnych; społeczeństwo Hajnówki, towarzysze broni, wrzesień 1985 r."

— Некаторыя людзі папракалі мяне, быццам не ўмеў прыгажэй напісаць, — кажа мастак. — А я наўмысна зрабіў так, быццам гэта дзесьці пісаў салдат на лапіку паперы.

Салдат той загінуў між Гайнаўкай і Навасадамі, дзе падбіў нямецкі танк; побач яго загінулі яшчэ два салдаты. Спярша яго пахавалі ў Будах, а пасля вайны іхнія астанкі перапахавалі на ваенныя могілкі ў Беластоку.

Міхал Мінцэвіч

Ці заслужылі на помнік?

Пра бальшавікоў можна гаварыць розное, але свет іх рашуча асудзіў і я за гэтым прыгаворам. Бо што за сэнс знішчаць найлепшыя гаспадаркі і іх уласнікаў, стаўляючы на іх месца найгоршых? Альбо навошта было расстрэльваць апошняга рускага цара разам з сям'ёй? Палякі маюць да саветаў слушны жаль за расстрэл палоненых польскіх афіцэраў у Катыні і іншых лагерах. Адно толькі дзіўна, што польскія ўлады і медыі маўчаць пра тое, што ў час польска-бальшавіцкай вайны 1919-20 гадоў у польскі палон трапіла 80 тысяч чырвонаармейцаў, якіх трымалі ў розных лагерах: Тухоля, Стшалуў, Домбе. Там тыя палонныя ад голаду, хвароб і нялюдскага трактавання стражнікамі загінулі. Гэта было таксама злачынствам, такім, як і кулі ў патыліцу. Сярод тых палонных чырвонаармейцаў былі напэўна і добрыя людзі, вартыя помніка. У Катыні даўно стаіць помнік-крыж па загінуўшых з савецкіх рук паляках. Цяпер чарга, каб і палякі такі высакародны жэст зрабілі ў адносінах да сваіх ахвяр.

Мікалай Панфілюк

Праваслаўныя палякі ў Расіі

Адгалоскі

У „Ніве" № 39 у адгалосках „Яшчэ пра архіепіскапа Афанасія" (рг) піша: „Я яго (архіепіскапа Афанасія) пытаў, што ў Расіі робіцца для праваслаўных палякаў (*вылучэнне маё — Д. Ш.*), але ён — будучы беларусам — не праявіў зацікаўленасці". Мяне зацікавіла справа праваслаўных палякаў у Расіі. Ці іх там так многа, што для іх трэба нешта рабіць? Адкуль яны? Я не думаю, што праваслаўныя беларусы ці праваслаўныя ўкраінцы, якія жылі ў межах даваеннай Польшчы, а цяпер знаходзяцца на тэрыторыі Расіі, называюць сябе праваслаўнымі палякамі. Можа ёсць там некалькі дзесяткаў ці соцень палякаў-каталікоў, раскіданых па ўсёй тэрыторыі Расіі, якія прынялі праваслаўе, але што для іх там трэба рабіць?

Я ў 1974 г. у Сараеве зайшоў з жонкаю ў праваслаўную царкву. Жонка сказала святару, што мы — праваслаўныя палякі (замест сказаць, што мы праваслаўныя грамадзяне Польшчы). Святар вельмі сардэчна рассмяяўся і сказаў, што ён першы раз чуе, каб палякі былі праваслаўнымі. „Вы напэўна з'яўляецеся беларусамі ці ўкраінцамі, а можа рускімі і жывяце ў Польшчы ды маеце яе грамадзянства". Але іншая справа Польшча, а іншая Расія. У Польшчы частка беларусаў, украінцаў, а нават рускіх называе сябе праваслаўнымі палякамі, ці то ад страху, ці з-за моцнай асіміляцыі, што адчуваюць сябе палякамі і не хочуць прызнавацца да нацыянальнасці бацькоў ці дзядоў. Бо і ў Польшчы сапраўдных праваслаўных палякаў, якія з каталіцызму перайшлі на праваслаўе, вельмі мала. Гэта здараецца ў сем'ях мешаных, дзе адзін з членаў сям'і з'яўляецца праваслаўным, а другі — каталік ці каталічка — прымае праваслаўнае веравызнанне. Часам ксяндзы да гэтага змушаюць, бо не хочуць такім адпусціць грахоў на споведзі.

Але ў Расіі сітуацыя зусім іншая, там калі нават каталік прыняў праваслаўнае веравызнанне, то ён не будзе прызнаваца, што ён з'яўляецца палякам. І такіх людзей там ёсць вельмі мала.

Дзмітры Шатыловіч

Рыгор Каральчук, 30-я гады

На будаўніцтве чыгункі ў Белавежскай пушчы. Большая палова будаўнікоў з вёскі Лукі, 1935 год

Язэп Лаўнічук з жонкаю Вольгаю. Язэп — стрыечны брат Рыгора Каральчука, 1940 г. Вёска Лука

Мама ўсё жыццё сумавала па Беласточчыне

Рыгор Каральчук (справа) і Язэп Лаўнічук (сядзіць справа)

Сям'я Каральчукоў — Юля, Рыгор і дзеці Раіса і Генік

Сям'я Каральчукоў у Слоніме, 1950 г.

У горадзе Слоніме жыве цудоўная жанчына Раіса Каральчук. Яна ўжо на пенсіі, але яшчэ працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Сярэдняй школе № 4 г. Слоніма. Дзеці ўжо дарослыя: адна дачка з сям'ёй пражывае ў Краснадарскім краі Расіі, другая — у Ваўкавыску, сын Юрык — у Слоніме, а малодшая Юля вучыцца ў Лідскім музычным вучылішчы. Шмат гадоў я знаёмы са спадарыняй Раісай, але ніколі не пытаўся пра яе жыццёвы лёс. Аказалася, што Раіса Каральчук родам з Беласточчыны, з вёскі Лука. На днях мы сустрэліся за кубачкам кавы і яна расказала пра сябе і сваіх бацькоў.

— Я нарадзілася ў 1941 годзе, — пачала свой аповед Раіса Каральчук. — Са слоў маці Юліі Каральчук (1915-1965) я даведалася, што да вайны мы жылі ў вёсцы Лука. Калі ў 1941 годзе на Беласточчыну прыйшлі немцы, нас яны вывезлі ў Беласток. Спачатку мы жылі ў лагеры, а пасля нас немцы пасялілі ў доме па Мазавецкай вуліцы. Чаму яны так зрабілі, я не ведаю. Але, мусіць з-за таго, што наш бацька Рыгор Каральчук (1915-1979) быў вельмі добрым і адметным сталяром. Ён усе ваенныя гады працаваў у сталярцы: рабіў вокны, дзверы, сталы, табурэткі, лаўкі, шафы і іншую розную мэблю. І цяпер, калі я прыязджаю ў Беласток, часам пазнаю бацькавы вокны і дзверы ў многіх прыватных дамах, якія былі пабудаваны да вайны ці ў вайну.

У 1944 годзе мы зноў вярнуліся ў вёску Луку. У гэты час пачалася моцная агітацыя ехаць у Савецкі Саюз, маўляў, там шмат зямлі, добры заробак, можна пабудаваць дом для сям'і і г.д. А ў нас у Луцэ, сапраўды, было мала зямлі, ды і хата — адна на трох братоў. Таму бацька вырашыў ехаць на Усход. Мама вельмі плакала, яна не хацела развітвацца з Беласточчынай, са сваімі роднымі і блізкімі людзьмі. Маці вельмі моцна кахала бацьку, паважала яго і слухала: куды ён — туды і яна.

У адзін з асенніх дзён мы, а гэта я, мама, тата і старэйшы брат Генік, сабраліся ў дарогу. Нам і яшчэ адной сям'і выдаткавалі цэлы вагон, куды мы загрузілі свае рэчы, мэблю, карову, свіней і пачалі развітвацца. Я была яшчэ маленькая, але тое шчымлівае развітанне памятаю і сёння. Мы так не хацелі нікуды ехаць, моцна плакалі, перажывалі. Але, відаць, найбольш плакала і хвалявалася мама.

Цягнік нас некалькі дзён вёз на Усход. Спыніліся мы на Магілёўшчыне, але ў якім раёне, не памятаю. У памяці засталася толькі назва станцыі — Цёмны Лес. На гэтай станцыі пасяліліся ў аднаго гаспадара. Жыў ён на нейкім хутары каля лесу. Ахапіў нас нейкі самотны адчай і туга па радзіме. І ўсё ж мы паціху неяк перазімавалі, а вясною бацька паехаў на Гродзеншчыну шукаць лепшага месца. Тым больш, што ягоны брат Язэп з сям'ёю жыў на Ваўкавышчыне. Едучы ў Ваўкавыск, бацька спыніўся ў Слоніме. Тут ён сустрэўся з мясцовымі жыхарамі, якія ў час гутаркі прапанавалі яму працу ў арцелі „Красный столяр".

Мы радасныя і шчаслівыя пераехалі бліжэй да Беластока ў Слонім, тут ад татавай працы нам далі кватэру. У горадзе над Шчарай мы аселі на ўсё жыццё.

Жывучы ў Слоніме, мама ўсё роўна вельмі сумавала па Луцэ і яе людзях. У канцы 1950-х гадоў ёй пасля ростані ўпершыню ўдалося наведаць Беласток і Луку, сустрэцца са сваімі роднымі і блізкімі людзьмі.

У Слоніме мае бацькі пабудавалі новы прыгожы дом, тут нарадзіўся мой малодшы брат Жорык. Але мама пражыла толькі 50 гадоў...

Калі Беларусь стала незалежнаю дзяржавай, я стала часцей наведваць Беласточчыну. У Беластоку жыве мая родная цётка, маміна сястра Марыя Матысюк. Спыняюся заўсюды ў яе. І калі там бываю — успамінаецца маё маленства, мама і тата...

Сяргей Чыгрын

Юля і Рыгор Каральчукі ў новай хаце ў Слоніме, 1959 год

Першая сустрэча Юлі Каральчук са сваякамі ў Беластоку, канец 50-х гадоў

Чацвёртая ўлада

У 40 н-ры „Нівы” Мацей Халадоўскі („Выбарчая вера ў амнезію”) напісаў пра дзеянні беластоцкіх улад, прымеркаваныя да палітычных падзей, а канкрэтна — да выбараў. Я не надта ўпэўнены, ці ўсе згаданыя там факты акурат былі здзейснены пад прымільнасць выбаршчыку. Бо ж, дзеля прыкладу, ці тая акцыя мамаграфіі не павінна была праводзіцца, бо акурат выбары?

Устанаўленне святлафораў на Нараўскай вуліцы я лічу звычайна медыяльным, а не істотным, фактам. Нейкі журналіст, бадай у „Кур’еры Паранным”, напісаў пра вялікую патрэбу паставіць там такую сігналізацыю. І паднялася медыяльная шуміха вакол гэтай тэмы. Спадар Халадоўскі падказвае нам, што ўлада падштурхнула беластоцкі тэлецэнтр заняцца гэтай тэмай; калі так, дык тая ж улада відаць падштурхнула і Халадоўскага. А ў сапраўднасці святлафоры на Нараўскай вуліцы не так неабходныя, бо ад нашумелага перахода не больш пяцідзесяці метраў да найбліжэйшых святлафораў, а па абодвух баках Антанюкоўскай вуліцы ёсць усё неабходнае, напрыклад, крамы, і няма вялікай патрэбы хадзіць праз яе туды-сюды ды яшчэ стаўляць там сігналізацыю, якая больш патрэбная ў іншых месцах. Для прыкладу, на днях дарожныя службы пачалі такое стаўляць на скрыжаванні вуліц Складовай і Пагоднай, дзе яна папросту неабходная; я пішу гэта не на аснове нейкіх журналісцкіх падказак, але ўласных назіранняў.

Наша чацвёртая ўлада, значыць сродкі масавай інфармацыі, не лепшая за ўсе апошнія ў нашай краіне. Некалькі месяцаў таму журналіст са згаданага „Кур’ера” ўзняў шум, што ў крамцы па вуліцы Бэма прадаецца пратэрмінаваная перыёдыка. Заходзіў я туды часта, так як і процьма людзей, якія хацелі купіць нешта вартаснае, што ім па кішэні. І наш стаханавец чацвёртай улады дабіўся імгненнага закрыцця таго пункта; маўляў, навошта чытаць? — на тое ж вучыліся гадамі, каб цяпер глядзець тэлевізар з *reality show*.

Я папракнуў спадара Халадоўскага за ўяўную прывязку нашых нешматлікіх падзей да палітычнага жыцця, але, на жаль, бывае і сапраўдная такая інтэрферэнцыя. Многія дзесяцігоддзі спачывалі ў чужой зямлі косці нашых сялян, злачынна пабітых вазакоў з даўнейшай Бельшчыны. Шмат гадоў цягнецца катавасія пра змест эпітафіі ім; блізіцца яна да канца. Я пазваніў галоўнаму хадайніку ў гэтай справе, палкоўніку Антанюку, калі адбудзецца афіцыйная ўрачыстасць адкрыцця надпісу; спадзяваўся я, што мо пад гадавіну трагедыі, або нават пад Свята памерлых. Спадар Антанюк паведаміў мне, што перад выбарамі...

Я ўяўляю гэта так: сыдзецца шмат народу. Будзе святар, які скажа пропаведзь пра *скорбь и печаль*. Не абыдзецца таксама і без „атэістаў”, *niewierzących i niepraktykujących*. І цікава мне, ці яны таксама будуць смуткаваць і шкадаваць, ці мо думаць пра скорыя выбары. У спадара Антанюка я пра гэта не даведаўся, бо пра падрабязнасці раіў мне ён пачытаць у „Кур’еры Паранным”.

Шмат нашых людзей ставіла мне закіды, што „Ніва” празмерна займаецца палітыкай. Не буду аспрэчваць я гэтага, бо ж з нейкага пункту гледжання гэта шчырая праўда. Аднак, каму ў нас палітыкі замала, можа любавацца ёю ў шмат якіх іншых выданнях. Бо наша чацвёртая ўлада — мовячы словамі генерала Карла фон Клаўзевіца — з’яўляецца прадаўжэннем палітыкі. І наша жыццё, нават патойбаковае...

Аляксандр Вярбіцкі

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Лена Роля (справа) і Галіна Семянюк

У Орлі размаўляем па-свойму

У цэнтры Орлі, які тут называюць Рынкам, чатыры прадуктовыя крамы: адна гэсаўская і тры прыватныя. Ува ўсіх вельмі ветлівы персанал. На гутарку пра дзелавыя справы калісь і сёння згадзіліся прадаўшчыцы прыватнай крамы Лявона Тамчука, пра якога сказалі: наш шэф — *суперфацэт*; мы выконваем нашы абавязкі і працуецца нам добра.

Лена Роля працуе прадаўшчыцай больш дзесяці гадоў, найбольш у Орлі, але раней працавала і ў пэсэсаўскай краме ў Бельску.

— Працавала я, — кажа, — калі яшчэ ўсё было на „карткі”, якія мы былі абавязаны прыклейваць. Мяса, каша, цукар — усё было на карткі. Тады, пры камуне, людзі мелі грошы, але ў крамах не было тавару. Стаялі ў чэргах і разбіралі ўсё датла, да апошняй рэчы. Нічога не марнавалася, бо не было як, таму што ўсё сходзіла адразу і пастаянна не хапала тавараў. Не было, так як цяпер, ніякіх запасаў на нашым складзе. Пры камуне людзі не куплялі напавер, не мусілі.

Ці тады прадаўшчыцы давалі фольгавую сумачку для пакупак? Тады ніякай фольгі не было, усё клалі ва ўпаковачную паперу. Цяпер амаль пагалоўна пакупнікі прыходзяць у краму без сумак.

У нашу краму прывозяць печыва аж з трох пякарняў: дзвюх з Беластока і адной з Кляшчэль; найлепшы хлеб з апошняй пякарні. Маем размаітасць вяндлін: сакалоўскія, беластоцкія, Нэтэр...

Галіна Семянюк прадаўшчыцай працуе пяць гадоў; спярша таксама працавала ў Бельску, а два апошнія гады — у Орлі.

— Раней, — кажа, — людзі рабілі большыя пакупкі, а цяпер адно самыя неабходныя, хаця людзі ў Орлі забяспечаныя. Калі я працавала ў Бельску, у 1996-97 гадах, то ўжо наспявала продаж напавер; дарэчы, я працавала ў бедным пасляпэгэераўскім мікрараёне. І так гэта завялося; у Орлі таксама прыходзіцца прадаваць напавер.

Дзе выгадней працаваць: у Бельску ці ў Орлі?

— У Бельску, у маладым квартале, рух быў вялікі, але і ў Орлі не наракаем на нястачу пакупнікоў. Мо ў Орлі яны больш сімпатычныя: у Бельску гаварылася па-польску, а тут па-свойму і гэта выгадней.

* * *

Прыгадваю сабе шумны эпізод у арлянскай гэсаўскай краме ў час салідарніцкага ўзлёту. Нейкая жанчына, якая прыехала да нашай шаптухі, увайшоўшы ў краму пачула, што людзі між сабою размаўляюць па-свойму. Яна вельмі ўскіпела і закрычала:

— A co, po polsku to nie umie rozmawiać! Gdzie my żyjemy?!

Людзей гэта абурыла і яшчэ доўгі час каменціравалі тое здарэнне. Невядома толькі, ці тая жанчына ўсведамляла, што на яе немач мела дапамагчы малітва праваслаўнай шаптухі.

Міхал Мінцэвіч

Крыжаванка

Гарызантальна: 2. бразільскі штат з Форталезай, 4. адкрытая частка сцэны, што выступае ў залу, 6. яго сейбіт пажне буру, 7. перад бэтай, 9. наддунайскі горад на поўнач ад Будапешта, 11. магчымая небяспека, 12. аўтаномная рэспубліка з Сухумі, 13. індыйска-пакістанская пустыня, 15. дзіцячы лагер на Крыме, 17. горад на поўначы Чылі, 18. дзяржава з Буэнас-Айрэс, 19. Уладзімір Ульянаў.

Вертыкальна: 1. дугавы скок каня, 2. бягун на доўгія дыстанцыі, 3. украінскі порт, 4. прафесія акцёра, 5. Луіс, мексіканскі кінарэжысёр, 6. балгарскі горад на паўночным схіле Старой Планіны, 8. аб’ява аб канцэрце, 9. адзінка вымярэння магутнасці электрычнага току, 10. уладар Расійскай імперыі, 14. працаўнік у дыскусіі, 16. яўрэйская абшчына, 17. большы ад мора.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку з 35 нумара

Гарызантальна: апарат, водсвет, ананас, Лімерык, арамат, Ніклат, аблетак, танбур, Аленкар, канкан.

Вертыкальна: Авалон, здымак, сварка, атака, атава, Амапа, рэльеф, матыка, Такара, Ітака, Любек, таран.

Рашэнне: **Увосень перамен восем**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Белая нядзеля

29 верасня г.г. гайнаўскі ЗОЗ арганізаваў у Гмінным асяродку здароўя ў Чаромсе белую нядзелю. Пацыентаў прыймалі кардыёлаг і спецыялісты эндакрыналагічнай і дыябеталагічнай амбулаторыі. Праводзілася навучанне абследавання грудзей жанчын.

У час белай нядзелі кардыёлага наведала 47 хворых, эндакрынолага — 17 і спецыяліста па дыябеце — 12 асоб. Было выкананых 69 электракардыялагічных абследаванняў, 104 асобы праверылі ціск крыві, 18 жанчынам абследавалі грудзі, а 92 пацыенты праверылі ўзровень цукру. Белая нядзеля даказала, што дырэкцыя Гайнаўскага ЗОЗ акуратна ставіцца да патрэб чаромхаўскага асяроддзя.

(ус)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

МЫ Ў СЯБЕ

Люблю наш край, старонку гэту...

БЕЛАРУСКІ ВЫБАРЧЫ КАМІТЭТ

Kandydaci Białoruskiego Komitetu Wyborczego w wyborach samorządowych 27 października 2002 r. do Rady Miejskiej w Białymstoku

Okręg Nr 1 (osiedla: Śródmieście, Liniarskiego, Przydworcowe, Kopernika, Tysiąclecia, Skłodowskiej, Piaski, Waryńskiego, Bema):

1) Lidia Smyk, 2) Oleg Łatyszonek, 3) Aleksander Maksymiuk, 4) Jerzy Mazuruk, 5) Mirosław Kopciński, 6) Joanna Tyszko, 7) Paweł Stachwiuk.

Okręg Nr 2 (osiedla: Sienkiewicza, Białostoczek, Pietrasze, Wysockiego-Zgoda, Jaroszówka, Wyżyny, Bagnówka, Pieczurki, Wygoda, Traugutta):

1) Jerzy Chmielewski, 2) Jerzy Szulski, 3) Stefan Bazyluk, 4) Tamara Dorota Łukasiewicz, 5) Dariusz Samsonik, 6) Eugenia Spalik, 7) Iwona Hulko.

Okręg Nr 3 (osiedla: Bojary, Kraszewskiego, Chopina, Piasta I, Piasta II, Skorupy, Nowe, Dojlidy, Przemysłowe, Mickiewicza):

1) Grażyna Gresiuk, 2) Antoni Mironowicz, 3) Anna Gryciuk, 4) Michał Stelmaszuk, 5) Aleksander Suszczenia, 6) Marek Anchimiuk.

Okręg Nr 4 (osiedla: Nowe Miasto, Ścianka, Bażantarnia, Starosielce, Zielone Wzgórza, Słoneczny Stok, Leśna Dolina, Marczuk, Młodych):

1) Władysław Pietruk, 2) Piotr Chomik, 3) Alina Wawrzeniuk, 4) Ludmiła Utrutko, 5) Mikołaj Walicki, 6) Witalis Łuba, 7) Bożenna Bałdowska, 8) Andrzej Żamojda, 9) Dariusz Małaszewski.

Okręg Nr 5 (osiedla: Tuwima, Przyjaźń, Sady Antoniukowskie, Dziesięciny I, Fasty, Bacieczki, Wysoki Stoczek, Bacieczki II, Dziesięciny II, sołectwo Zawady):

1) Małgorzata Borys, 2) Leon Sawczuk, 3) Jarosław Timofiejuk, 4) Aleksander Kazimierczyk, 5) Halina Gryk, 6) Włodzimierz Sewastianiuk, 7) Krzysztof Sieśkiewicz.

Do Sejmiku Województwa Podlaskiego

Okręg Nr 1 (miasto Białystok):

1) Sokrat Janowicz, 2) Mikołaj Kuryło, 3) Mirosława Łuksza, 4) Piotr Giermaniuk, 5) Arnold Toczyski, 6) Maciej Juliusz Chołodowski, 7) Andrzej Łukaszewicz, 8) Piotr Prokopczyk.

Okręg Nr 4 (powiaty: zambrowski, wysokomazowiecki, siemiatycki, bielski):

1) Jan Czykwin, 2) Piotr Juszczuk, 3) Luiza Ewa Bałdowska, 4) Tadeusz Supiński, 5) Anna Szerszeń.

Okręg Nr 5 (powiaty: moniecki, sokólski, hajnowski, białostocki):

1) Eugeniusz Wappa, 2) Włodzimierz Łukoszyk, 3) Jan Topolański, 4) Mirosław Pac, 5) Grażyna Pawluczuk, 6) Józef Jodczyk, 7) Ewa Jolanta Sawicka, 8) Mariusz Niczyporuk.

Kandydaci Koalicji Bielskiej do Rady Miasta Bielska Podlaskiego

Okręg Nr 1:

1) Sławomir Iwaniuk, 2) Jan Kondratiuk, 3) Tamara Rusaczyk, 4) Jerzy Bajena, 5) Irena Grygoruk, 6) Jolanta Sorokin-Fiedoruk, 7) Andrzej Krzywiec, 8) Aleksander Naumczyk, 9) Sławomir Mojsik, 10) Mikołaj Szachowicz, 11) Krzysztof Gliwa, 12) Jerzy Zabrocki.

Okręg Nr 2:

1) Zenaida Nowicka, 2) Mirosław Jakubiuk, 3) Maria Ryżyk, 4) Walenty Łapciew, 5) Bazyli Niedźwiecki, 6) Helena Burzyńska, 7) Ireneusz Krasowski, 8) Alina Dąbrowska, 9) Andrzej Kordiukiewicz, 10) Włodzimierz Polanowski.

Okręg Nr 3:

1) Aleksander Bożko, 2) Mikołaj Chrol, 3) Mikołaj Budka, 4) Anatol Puławski, 5) Jan Grygoruk, 6) Anna Korowaj, 7) Piotr Czerniakiewicz, 8) Bogdan Simonienko, 9) Piotr Aleksiuk, 10) Jan Sulima.

Okręg Nr 4:

1) Piotr Kondratiuk, 2) Andrzej Wyszkowski, 3) Roman Jakubiuk, 4) Włodzimierz Sac, 5) Wiktor Wiszniewski, 6) Dariusz Fionik, 7) Andrzej Szarko, 8) Mikołaj Martyniuk, 9) Jarosław Paniutycz, 10) Jerzy Łukaszuk.

Kandydaci Koalicji Bielskiej do Rady Powiatu Bielsk Podlaski

Okręg Nr 1 (miasto Bielsk Podlaski):

1) Bazyli Leszczyński, 2) Sergiusz Łukaszuk, 3) Jan Kiryziuk, 4) Helena Buszko, 5) Mikołaj Wiazowski, 6) Irena Zinkiewicz, 7) Grzegorz Sulima, 8) Stefan Wyrkowski, 9) Eugeniusz Bedeniczuk, 10) Włodzimierz Gliwa, 11) Elżbieta Nielipińska, 12) Janusz Werszko, 13) Jerzy Sosniuk, 14) Włodzimierz Tkaczuk, 15) Mirosław Burzyński, 16) Jerzy Czykwin.

Okręg Nr 2 (gminy: Boćki, Orla, Brańsk, Rudka, miasto Brańsk):

1) Eugenia Wasiluk, 2) Eugeniusz Tymoszewicz, 3) Mirosław Bałło, 4) Piotr Selwesiuk, 5) Helena Pasiecznik, 6) Walentyna Marcinowicz, 7) Teodor Żurawl, 8) Mikołaj Szkoda, 9) Zenobiusz Gul.

Okręg Nr 3 (gminy: Bielsk Podlaski i Wyszki):

1) Piotr Bożko, 2) Walenty Gliwa, 3) Jan Roszczenko, 4) Jerzy Żmieńko, 5) Anatoliusz Siemieniuk, 6) Włodzimierz Gawryluk, 7) Marek Mojsik.

Kandydaci Białorusko-Ludowego Komitetu Wyborczego do Rady Miasta w Hajnówce

Okręg Nr 1:

1) Eugeniusz Saczko, 2) Michał Bajko, 3) Mirosław Mordań, 4) Mikołaj Jewdosiuk, 5) Piotr Markiewicz, 6) Wiktor Dzik, 7) Wiktor Golonko, 8) Jan Karczewski, 9) Witalis Kicel, 10) Lidia Juszczuk, 11) Aleksander Wołczuk.

Okręg Nr 2:

1) Eugeniusz Jańczuk, 2) Bazyli Iwaniuk, 3) Jan Pietruczuk, 4) Piotr Karpiuk, 5) Sergiusz Awksientjuk, 6) Olga Sienkiewicz, 7) Janusz Puch, 8) Anatol Owsieniuk, 9) Ewa Sadowska-Czmak, 10) Mikołaj Koszel, 11) Taisa Kerschbaum, 12) Grzegorz Szwarc, 13) Anna Charkiewicz, 14) Leon Kondraciuk.

Okręg Nr 3:

1) Mikołaj Golonko, 2) Jan Lemiesz, 3) Anatol Filipczuk, 4) Jan Gromotowicz, 5) Walentyna Ostaszewska, 6) Michał Juszczuk, 7) Luba Bujnowska, 8) Jan Kuptel, 9) Aleksy Borowik, 10) Olga Osipiuk, 11) Piotr Czerniakiewicz.

Kandydaci Białorusko-Ludowego Komitetu Wyborczego do Rady Powiatu Hajnówka

Okręg Nr 1:

1) Michał Androsiuk, 2) Piotr Sakowicz, 3) Michał Gołub, 4) Anatol Łapiński, 5) Nela Szczuka, 6) Sławomir Czykwin, 7) Nina Bura, 8) Bazyl Stepaniuk, 9) Anatol Kalinowski, 10) Paweł Iwacik, 11) Jerzy Jańczuk, 12) Jan Kozak, 13) Włodzimierz Szeszko, 14) Leon Topolewski, 15) Michał Piasecki.

Okręg Nr 2:

1) Mikołaj Janowski, 2) Mirosław Romaniuk, 3) Eugeniusz Kowalczuk, 4) Andrzej Józef Nowak, 5) Roman Wołkowycki, 6) Jan Adamczuk.

Okręg Nr 3:

1) Jarosław Gerasimiuk, 2) Nina Oksentiuk, 3) Michał Kuryło, 4) Sławomir Kulik, 5) Jerzy Nazaruk, 6) Maria Leoniuk.

Okręg Nr 4:

1) Eugeniusz Abramiuk, 2) Jarosław Charkiewicz, 3) Tamara Moroz, 4) Jan Naumczyk, 5) Aleksander Stańko, 6) Jarosław Stocki.

ISSN 0546-1960